Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз. Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вярачаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 7 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародніх—20 к. месцовых —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок капіталы пасьля тэксту — р. 50 к. За радок капіталы наскрозь тэксту 1 р. — к. За радок капіталы перад тэкстам 1 р. 50 к. Скідкі из 50 проц. дражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант . . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8-мы ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 95 (1987) Чацьвер, 28-га красавіка 1927 г.

Перамога няўхільна.

(Артыкул намесьніка генэральнага сэкратара Прафінтэрна А. Ніна).

Сёлета дзень Першага Мая супадае з надзвычайна напружаным міжнародным становішчам і з узмацненьнем атакі капіталу на самыя элемэнтарныя правы рабочае клясы.

Супярэчнасьці капіталізму з кожным днём паглыбляюцца і павялічваюцца, міжнароднаму міру пагражае сталая небясьпека. Даволі аднэй іскры дзе-небудзь—на Балканах, на Ціхім Акіяне,—у тых частках земнае кулі, дзе небясьпека выбуху найбольш вялікая, каб запаліць сусьветную вайну, куды больш страшэнную па сваіх разьмерах і па сваіх выніках, чымся вайна 1914-1918 г. г. З нячуванай лютасьцю, ня спыняючыся ні перад чым, імпэрыялізм імкнецца задушыць вызваленчы рух калёніяльных і поўкалёніяльных народаў, які ўжо пахіснуў самыя асновы капіталістычнага панаваньня. Прыклады Кітаю і Цэнтральнай Амэрыкі вельмі шырока вядомы, каб на іх спинятца. З другога боку, міжнародны капітал, пры дапамозе палітыкі абураючай правакацыі, вядзе шырокую кампанію проці Савецкага Саюзу. Самым блізкім прыкладам падобнае правакацыі зьяўляецца нядаўні напад на савецкае пасольства ў Пекіне, зроблены паліцыяй Чжан-Цзо-Ліна і падрыхтоўка да ўзброенага нападу на першую рэспубліку працоўных.

Такім чынам міжнародная атмасфэра вельмі напружана, і здань вайны ўсё ясьней і ясьней паўстае на кругавідзе. У падобных абставінах кожны рэвалюцыянэр, кожны сьвядомы рабочы з трывогаю пытаецца ў сябе: няўжо ў выпадку вайны, у выпадку інтэрвэнцыі проці Савецкага Саюзу паўторыцца тое ганебнае зьявішча 1914 году, няўжо мы ўбачым, як рабочая кляса ваюючых краін пойдзе на бойню і не паспрабуе абярнуць імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую, не паспрабуе скінуць панаваньне буржуазеі, як гэта з посьпехам зрабіў расейскі пралетарыят у 1917 г.?

У якім-жа становішчы знаходзіцца рабочая кляса, ці можа яна адбіваць атакі капіталізму? Яна распылена ў нацыянальным і міжнародным маштабе, і рэфармісцкія правадыры, якія карыстаюцца яшчэ значным уплывам на большую частку пралетарыяту, замест тэго, каб рыхтавацца да адпору і да барацьбы, робяцца вернымі слугамі капіталізму. Здрада генэральнае забастоўкі ў Англіі, ліквідацыя італьянскае ўсеагульнае канфэдэрацыі працы і пераход ае правадыроў да фашыстаў, «дзелавое» супрацоўніцтва ангельскіх, нямецкіх і амэрыканскіх прафсаюзных правадыроў з буржуазеяй на грунце ажыцьцяўленьня рацыяналізацыі за кошт рабочае клясы, палітыка выключэньня актыўных рабочых барацьбітоў з прафсаюзаў,—вось красамоўныя прыклады ганебнае пазіцыі міжнароднага рэфармізму.

Гэткі адмоўны бок малюнку. Паглядзім цяпер на станоўчы бок. Не зважаючы на аб'яднаныя сілы буржуазеі і меншавікоў, рабочая кляса то там, то тут выяўляе сваю волю да бойкі і сваё імкненьне вызваліцца ад рэфармісцкіх ілюзій. У рэфармісцкіх прафсаюзах расьце рэвалюцыйная апазіцыя. Рэвалюцыйныя прафсаюзныя арганізацыі ўмацоўваюцца ва ўсіх краінах. Вельмі часта рэфармісцкія правадыры аказваюцца прымушанымі пад націскам мас весьці бой проці атак капіталізму. Ідэя адзінства захапляе ўсё больш і больш шырокія масы. Ужо недалёка той дзень, калі сучасны раскол зьнікне, каб даць месца аб'яднаным прафсаюзным арганізацыям, у нацыянальным і міжнародным маштабах.

У выпадку вайны з упэўненасьцю можна сказаць, што ганебныя абставіны 1914 г. не паўторацца. Зразумела, рэфармісцкія правадыры яшчэ раз могуць здрадзіць пралетарыяту, але, бязумоўна, апошні будзе рэагаваць на гэта больш энэргічна. Вурок 1914—1918 г. не прапаў дарма. Тое, чаго ня было ў 1914 г.—Камуністычны Інтэрнацыянал—існуе цяпер. Яго нацыянальныя сэкцыі маюць сапраўдны ўплыў на рабочыя масы найбольш важных краін. У выпадку вайны рэвалюцыйныя дзеяньні ня прымусяць сябе чакаць. Таксама мы можам сказаць, што інтэрвэнцыі проці Савецкага Саюзу прыходзіцца менш баяцца. Ня трэба забываць, што ў 1914—20 г. актыўная частка рабочае клясы перашкодзіла задушыць нашу рэспубліку, а калі гэта было магчыма зрабіць 7 гадоў таму назад, дык гэта будзе яшчэ больш магчымым цяпер, калі сымпаты да Савецкага Саюзу захапляюць усё больш і больш шырокія масы, і калі мы сталі куды мацнейшымі.

У канцы трэба сказаць, што, не зважаючы на адносную стабілізацыю капіталізму і частковыя паражэньні рабочае клясы, рэвалюцыйны пэрыяд, які распачаўся з часу імпэрыялістычнае вайны, далёка ня скончаны. На вялізным фронце сусьветнае рэвалюцыі барацьба адбываецца далей. У выніку гэтае барацьбы, доўгай, поўнай цяжкасьцяў, пераможны пралетарыят скіне капіталізм.

БЛІЖЭЙ ДА РЭАРГАНІЗАЦЫІ АПАРАТУ.

На дзесятым годзе рэвалюцыі мы ўзялі рашучыя крокі для таго, каб стары бюракратычны апарат перарабіць на новы лад. Па ўсіх наркаматах ідзе праца па пераводу апарату, на так званую функцыянальную сыстэму. Хоць гэта рэарганізацыя даўно пасьпела, але пры правядзеньні рэарганізацыі западта сьпяшыць нельга; трымацца старага прыслоўя—семь раз адмер, а адзін адрэж—не пашкодзіць у гэтай працы. Бо праца сур'ёзная і адпаведная. Мы здолеем зрабіць дзяржаўны апарат менш грамоздзкім, больш таным, больш зьвязаным непасрэдна з працоўнымі масамі.

Але-ж трэба адзначыць, што гэта рэарганізацыя праводзіцца неяк «кехейна», унутры габінэтаў. А гэта ўжо дрэнная аднака. Трэба, каб рабочыя і сяляне ведалі дасканала аб тым, як мы думаем спрасьціць апарат, прыблізіць яго да масы, зрабіць усё тое, каб апарат сапраўды абслугоўваў рабочых і сялян. Трэба-б было пачаць хоць бы з добрага растлумачэньня словаў «функцыянальная сыстэма». У прэсе не адбіваецца, які ўдзел у гэтай працы прымаюць кам'ячэйкі, мясцкомы, як абгаварваецца гэтая справа на агульных сходах супрацоўнікаў.

Калі мы пераводзім дзяржаўны апарат на функцыянальную сыстэму, дык тут мы маем толькі аднабаковы працэс,—апарат будзе больш спрошчаным, больш гібкім, будзе дзешавейшым—але ён усё-ж застанецца бюракратычным апаратам. А наша мэта — уцягнуць пралетарыят, уцягнуць усе працоўныя масы ў дзяржаўнае будаўніцтва. І вось калі мы распачалі рэарганізацыю, дык мы павінны разглядаць яе, як працэс двухбаковы. З аднаго боку функцыянальная сыстэма працы апарату і адначасова ўцягненьне больш шырокіх мас у дзяржаўнае будаўніцтва. Без непасрэднага ўдзелу мас, без кантролю і дапамогі рабочых і сялян мы пастаўленай перад сабой задачы ня вырашым.

Адгэтуль, гаворачы аб рэарганізацыі апарату, як такога, мы адначасова таксама пільна павінны падыйсьці да працы начных гарадзкіх саветаў і іх сэкцый. Тут у нас таксама ня ўсё «обстоит благополучно». Калі ўжо і знойдзены сякія-такія формы працы сэкцый гарсавету, дык гэта нельга сказаць наконт зьместу гэтай працы. Шмат сяброў гарсаветаў (таксама ЦВК) зьяўляюцца пасыўнымі не таму, што яны ня хочуць, або ня могуць працаваць, а таму, што гэтай працы мы ня здолелі арганізаваць. Над гэтым пытаньнем трэба падумаць, трэба выкарыстаць вопыт нашых буйных цэнтраў, як Масква і Ленінград.

У гэтай працы шмат могуць дапамагчы нашы газэты. Чаму, напрыклад, органу ЦВК БССР «Савецкай Беларусі» ня ўзяць на сябе ініцыятыву па арганізацыі экскурсіі членаў гарсаветаў нашых буйнейшых гарадоў у Ленінград і Маскву. Там бы яны падзяліліся з маскоўскімі рабочымі сваім вопытам, ды і самі запазычылі-б шмат карыснага.

Такія экскурсіі асабліва патрэбны цяпер, калі мы выбралі новы склад гарсавету і калі новыя сябры гарсавету як найхутчэй павінны быць уцягнуты ў арганічную працу той ці іншай сэкцыі.

А. Сянкевіч.

Арганізуйце свае сілы.

Першамайская адозва выканкомаў Камінтэрну і КІМ'у да пралетарыяў усіх краёў.

МАСКВА. **У першамайскай адозве да ўсіх пралетарыяў, да ўсіх працоўных, да ўсіх прыгнечаных народаў, да салдат і матросаў выканком Камінтэрну і выканком КІМ'у заклікаюць ўсіх пралетарыяў усіх, хто стаіць на баку працы, да барацьбы проці катаўскае вайны ў Кітаі.**

Вайна проці кітайскага народу,—гаворыцца ў адозьве,—гэта падрыхтоўка да вялізнае, новае, сусьветнае вайны. Ужо ідзе нячуваная правакацыя, каб выклікаць на вайну СССР—апору сусьветнага рабочага руху. Штаб гэтых правакатараў—у лягеры імпэрыялізму, раней усяго, у лягеры ангельскага кансэрватыўнага ўраду, гэтага правадыра Лігі Нацый.

У гэтай падрыхтоўцы буржуазея ўсямерна выкарыстоўвае сваіх сацыял-дэмакратычных агентаў.

Арганізуйце свае сілы. У дзень 1-га мая гучна ўздымеце свой абураючы голас.

Вы павінны прымусіць задрыжаць буржуазных злачынцаў.

Рыхтуйцеся абярнуць усякую вайну імпэрыялістаў у рэвалюцыйную грамадзянскую вайну проці буржуазеі.

Надыход прамысловага крызісу ў Амэрыцы.

НЬЮ-ЁРК, 28-IV. На нью-ёрскай фондавай біржы адзначацца вострае вялікі лік папер прапануецца да продажу. Зьнізіўся курс таксама і на пра-

УДАР ХАНЬКОЎСКІХ ВОЙСК ПА АРМІІ ЧАН-КАЙ-ШЫ.

У бойцы пад Сватоу Чан-Кай-Шы панёс вялікія страты.

Агульнае становішча ў Кітаі.

ВОДЛУГ АФІЦЫЙНЫХ АНГЕЛЬСКІХ ПАВЕДАМЛЕНЬНЯЎ.

Бойкі на поўначы спыніліся.—Паўночцы дайшлі да левага берагу Янцзы пад Нанкіным.—У Шанхаі спакойна; горад перажывае эканамічны застой.

ЛЁНДАН, 26-IV. Афіцыйнае ангельскае радыё паведамляе, што ў адказе на запытаньні ў палаце вобшчын таварыш міністра замежных спраў Лёкер Лемпсон так ахарактарызаваў становішча ў Кітаі: «Ваенныя дзеяньні між паўночцамі і паўднёўцамі ў сучасны момант перарваліся. Рух паўднёўцаў на поўнач ад Янцзы быў спынен, і яны былі адагнаны на паўднёвае ўзьбярэжжа рэчкі ў райён Нанкіну войскам маршала Сун-Чуан-Фана, якое ізноў зьявілася на тэатры ваенных апэрацый. Аднак, войска паўночцаў не перайшло Янцзы. У сучасны момант тэрыторыі паўночцаў і паўднёўцаў разьмяжоўваюцца рэчкаю Янцзы, за выключэньнем райёну Ханькоу, дзе паўднёўцы, як і раней, займаюць пазіцыю на поўнач ад рэчкі.

Улада ханькоўскага ўраду распаўсюджваецца зараз на досыць нязначны райён у Цэнтральным Кітаі навакол Ханькоу, а вайсковая і цывільная ўлада ў ніжняй плыні Янцзы і ўздоўж марскога ўзьбярэжжа цьвёрда стаіць на баку Чан-Кай-Шы. Чан-Кай-Шы яшчэ не распачаў ніякіх ваенных апэрацый проці Ханькоу, але ўжо ўжыў захады проці экстрэмістаў на тэрыторыі, якую ён кантралюе.

У працягу месяцу з часу нанкінскага здарэньня чужаземная маёмасьць у Нанкіне ўсё яшчэ рабавалася. Аднак, згодна апошніх вестак, становішча некалькі палепшылася. Войска, як відаць, знаходзіцца пад лепшым кантролем, і выпадкі рабаўнаў зьменшыліся. Камуністы часткаю выехалі з Нанкіну, часткаю арыштаваны, і ў горадзе расклеены процікамуністычныя праклямацыі Чан-Кай-Шы.

У Вуху большая частка дамоў, якія належаць чужаземцам, занята войскам паўднёўцаў.

20-га красавіка пасьля захопу Цьзю-Цьляну першай нацыянальнай арміяй усе чужаземныя памяшканьні на тэрыторыі канцэсіі, а таксама брытанскае консульства былі рэквізаваны для войска, якое чакалася з Нанкіну. З прычыны пратэсту, перададзенага генэралу Чан-Кай-Шы, апошні забараніў свайму войску доступ на тэрыторыю цьзюцьзянскае канцэсіі, пасьля чаго памяшканьні консульства і тэрыторыя канцэсіі былі вызвалены нацыянальным войскам.

У самым Шанхаі спакойна, хоць горад перажывае застой».

Ханькоўскія войскі б'юць Чан-Кай-Шы.

НЬЮ-ЁРК, 26. З Шанхаю паведамляюць, што недалёка Сватоў (Гуандунь) ханькоўскія атрады нанесьлі паражэньне войскам Чан-Кай-Шы, якія панёсьлі вялікія страты.

ЧАН-КАЙ-ШЫ НАЗНАЧЫЎ ЦАНУ ЗА ГАЛОВЫ КАМУНІСТАЎ.

ШАНХАЙ, 26-IV. Водлуг паведамленьняў ангельскіх газэт, асобны аддзел і палітычны аддзел штабу Чан-Кай-Шы абвясьцілі ўзнагароду ад 500 да 1.000 даляраў за дапамогу затрымаць актыўных шанхайскіх камуністаў, якія пералічаны ў доўгім сьпісе.

Колькі каштуе Англіі шанхайскі корпус абароны

ЛЁНДАН, 27-IV. Ангельскае афіцыйнае радыё паведамляе: «Вайсковы міністэр сэр Лемін Вартынгтон Івэнс сказаў, што **да 31-га сакавіка ўключна ўтрыманьне корпусу абароны ў Шанхаі каштавала 950 тысяч фунтаў стэрлінгаў.** Выдатак гэты бюджэтам не прадугледжан.

Выдаткі па перавозцы войска складаюць блізка 250-ці т. фунтаў стэрлінгаў.

Нарэшце міністр зазначыў, што ён ня мае магчымасьці паведаміць лік выдаткаў за красавік».

12 АМЭРЫК. ПАДВОДНЫХ ЛОДАК КАЛЯ БЕРАГОЎ КІТАЮ.

ВАШЫНГТОН, 26-IV. **Марское міністэрства абвяшчае, што ў Гангконг паслана 12 амэрыканскіх падводных лодак.**

Апрача таго, у Шанхай накіравана яшчэ адно ваеннае судно з Манілы (Філіпіны).

АРЫШТАВАНЫЯ Ў ПАСОЛЬСТВЕ СССР КАМУНІСТЫ АДДАНЫ НАДЗВЫЧАЙНАМУ СУДУ.

ПЕКІН, 25-4. Камуністы, арыштаваныя ў Пекіне ў памяшканьнях супрацоўнікаў паўнамоцнага прадстаўніцтва, аддаюцца надзвычайнаму суду.

Першая арганізацыйная нарада суду адбылася ўчора. Было ўзьнята пытаньне, каб справа Лі-Тан-Чао і іншых 6-ці кітайскіх камуністаў разглядалася ў першую чаргу.

Нарада адбываецца ў суровай тайне.

ІТАЛЬЯНСКІ ПАСОЛ—ПАКОРНЫ СЛУГА АНГЛІІ.

БЭРЛІН, 25-IV. Водлуг вестак з Рыму, італьянскі пасланьнік у Пекіне, маючы інструкцыю ад свайго ўраду па ўсіх пытаньнях, якія датычаць інтарэсаў пратакольных дзяржаў, кіравацца дырэктывамі, атрыманымі ангельскім пасланьнікам, згадзіўся на выдачу дазволу на права рабіць вобыскі ў памяшканьнях пекінскага паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР. Італьянскі пасланьнік ня выказаў таксама ніякіх пярэчаньняў проці ўчынкаў чжан-цзолінаўскае ўлады пасьля наскоку на паўнамоцнае прадстаўніцтва і ўчыненых арыштаў.

Аднаўленьне працы на японскіх прадпрыёмствах у Ханькоу.

ШАНХАЙ, 26-IV. Японскае агэнцтва «Тохо» паведамляе: «У Ханькоу адбывалася нарада прадстаўнікоў мясцовае японскае гандлёвае палаты з прадстаўнікамі рады прафсаюзаў. Дасягнута згода на наступных падставах: 1) японскія прадпрыёмцы, якія засталіся ў Ханькоу, адновяць дзейнасьць сваіх прадпрыемстваў неадкладна; 2) нацыянальны ўрад і рада прафсаюзаў абавязваюцца абараняць жыцьцё і маёмасьць японцаў і перашкаджаць незаконным учынкам з боку рабочых, каб японскія прадпрыёмцы маглі весьці свае справы бесперашкодна; 3) нацыянальны ўрад абгаворыць супольна з японскімі прадпрыёмцамі пытаньне аб мерах дапамогі кітайцам, якія засталіся бяз працы, з прычыны эвакуацыі японцаў.

Мяркуецца, што японскія прадпрыёмствы адновяць сваю дзейнасьць 27-га красавіка».

НОВЫ АКТ КАМЭДЫІ З РАЗБРОЕНЬНЕМ.

ПЕРШАЯ РОЛЯ НАЛЕЖЫЦЬ АНГЛІІ.

БЭРЛІН, 23-IV. На пасяджэньні падрыхтоўчае камісіі канфэрэнцыі аб разброеньні ў Жэневе прадстаўнікі Фінляндыі, Польшчы і Румыніі прызнавалі, каб усе ўдзельнікі ўгавору аб разброеньні загадзя прынялі магчымыя агаворкі акраінных дзяржаў наконт таго, што канвэнцыя аб разброеньні не распаўсюджваецца на гэтыя дзяржавы, пакуль СССР не далучыцца да канвэнцыі на аднолькавых з памянёнымі дзяржавамі ўмовах. Прадстаўнік Японіі выказаў надзею, што такая вялікая дзяржава, як СССР, ня будзе доўга заставацца з боку ад канвэнцыі. Пры гэтым прадстаўнік Японіі, таксама як і прадстаўнік Швэдыі, даўны прыншыповую згод на прапанову акраінных дзяржаў, выказаўся за тое, каб спрэчкі па гэтай прапанове былі адкладзены да другога чытаньня.

Тады прадстаўнікі акраінных дзяржаў зьмянілі сваю прапанову ў адпаведнасьці з заявай прадстаўніка Англіі у тым сэнсе, што суседнія з СССР дзяржавы, пакуль СССР не бярэ ўдзелу ў канвэнцыі, звальняюцца не ад усіх абавязацельстваў па канвэнцыі, а толькі ад вядомых некаторых абавязацельстваў, якія будуць вызначаны ў часе другога чытаньня.

У гэтым зьмененым выглядзе прапанова акраінных дзяржаў была ўхвалена камісіяй.

РАСПРАЦОЎКА ЎВОДЗІН ДА КАНВЭНЦЫІ АБ „РАЗБРОЕНЬНІ".

БЭРЛІН, 24-IV. Падрыхтоўчая камісія канфэрэнцыі аб разброеньні ў Жэневе ўчора абгаварвала праэкт уводзін да канвэнцыі аб разброеньні. Падаючы нямецкі тэкст уводзін, які патрабуе ажыцьцяўленьня першага кроку ў абмежаваньні ўзброеньняў, з тым, каб каб услед за ім былі ўжыты і далейшыя крокі, прадстаўнік Нямеччыны Бэрнсторф падкрэсьліваў, што пры складаньні тэксту ўводзін ён кіраваўся жаданьнем скласьці такія ўводзіны, якія было-б мэтазгодны ня толькі для Злучаных Штатаў, але і для СССР. Пры гэтым Бэрнсторф выказаў надзею, што пры другім чытаньні праэкту ў працы камісіі возьме ўдзел і СССР.

Камісія пастанавіла абгавор усіх праэктаў уводзін адносьці да другога чытаньня.

Расчараваньне ў Эўропе працай камісіі.

БЭРЛІН, 24-IV. Міжнароднае бюро міру ў Жэневе (пацыфісцкая арганізацыя) зьвярнулася з адозваю да падрыхтоўчае камісіі канфэрэнцыі па разброеньні, у якой заяўляе, што «сьвет яшчэ ніколі ня быў ахоплен такім глыбокім расчараваньнем, як зараз», у зьвязку «з ходам працы падрыхтоўчае камісіі».

Гісторыя сурова асудзіць усіх тых,—гаворыць адозва—хто ў Жэневе ня меў даволі сьмеласьці сур'ёзна вывучыць праблему разброеньня і наблізіць яе да канчатковага вырашэньня.

Усе бяз выключэньня нямецкія газэты адзначаюць поўную няўдачу працы камісіі. «Дойчэ Альгэмэйнэ Цэйтунг» заяўляе: «Здань Рассеі ўжо ў працягу тыдню вітае над перамовамі, якія адбываюцца ў Жэневе. Бэрнсторф (нямецкі дэлегат у Жэневе) учора вітаў чакаемы ўдзел СССР у далейшай працы камісіі. Прадстаўнік Францыі—Клоэзэль неадкладна пасьледваў прыкладу нямецкага дэлегата. У той-жа час, задаюць пытаньне, ці трэба пасылаць у Маскву новыя запросіны, ці ко' досыць пасланых раней запросін. Трэба мець надзею, што ў Жэневе знойдуць адпаведную форму для вырашэньня гэтага пытаньня. У кожным разе відочна, што пытаньне аб разброеньні не пасунецца з месца бяз ўдзелу Рассеі, таксама, як яно не магло пасунуцца з месца бяз удзелу Нямеччыны. У адносінах да Нямеччыны гэта падкрэсьлілася пасьля краху жэнеўскага пратаколу на сэсіі Лігі Нацый у 1925 г. Няўдача працы падрыхтоўчае камісіі канфэрэнцыі па разброеньні прыводзіць да тых-жа вынікаў у адносінах да СССР, якія мелі месца пасьля няўдалага жэнеўскага пратаколу ў адносінах да Нямеччыны».

Перадмайскія рэпрэсіі проці кампартыі ў Баварыі.

БЭРЛІН, 26-IV. У Траўнштэйне (Баварыя) быў назначаны мітынг, на якім старшыня нямецкае рабочае дэлегацыі ў СССР Фрэйбэргер павінен быў выступіць з дакладам на тэму «Кітай, СССР і Англія». Паліцыя забараніла сход з тае нібы прычыны, што «тэма дакладу мае выразна камуністычны тэкст». Паліцыя таксама забараніла ў Траўнштэйне і арганізуемую нямецкай кампартыяй першамайскую дэманстрацыю. Адначасова паліцыя забараніла калёнам кампартыі са сьцягамі і эмблемамі чырвонае зоркі брацьць удзел у сходах, арганізуемых 1-га мая сацыял-дэмакратычнаю партыяю і ўсенямецкім

Выступленьне ангельскай каапэрацыі ў абарону прафсаюзаў.

ЛЁНДАН, 26-IV. Цэнтральная рада каапэрацыйнага саюзу (кіруючы орган ангельскага каапэрацыйнага руху, які налічвае 5 млн. членаў) ухваліла рэзалюцыю пратэсту проці ўрадавага законапраэкту аб прафэсыянальных саюзах. Цэнтральная рада папераджае ангельскіх каапэратараў, што капіталістычныя колы, патрабуючыя правядзеньня законапраэкту аб прафсаюзах, зьяўляюцца тымі-ж дзеляўмі і палітычнымі колямі, якія спрабуюць стварыць перашкоды разьвіцьцю каапэрацыі.

Рэзалюцыя заклікае ўсіх каапэратараў Англіі дапамагчы прафэсыянальным саюзам у іх барацьбе проці законапраэкту.

УРАДАВАЯ ПРАПАГАНДА ЗА РАЗГРОМ ПРАФСАЮЗАЎ.

Учора (25 красавіка) па ўсёй Англіі распачалася ўрадавая кампанія прапаганды на карысьць законапраэкту. У ліку іншых прамоўцаў выступалі ваенны міністр Вартынгтон Івэнс, міністр працы Штыль-Мэйтлянд, сэр Робэрт Хорн, сэр Кінгслей Вуд і інш.

Напомніўшы аб прамове Кука ў Даргеме (Кук заклікаў змагацца за законапраэктам аб прафсаюзах праз абвяшчэньне ўсеагульнае забастоўкі), Вартынгтон Івэнс сказаў: «Калі-б ў барацьбе проці законапраэкту была абвешчана ўсеагульная забастоўка, дык гэта азначала-б рэвалюцыю ў Англіі».

КАНФЛІКТ У СЯРЭДНЯ-НЯМЕЦКАЙ ВУГОЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Дамаганьні прафсаюзу адхілены арбітражам.

БЭРЛІН, 25-IV. Наладжаная ў Галі канфэрэнцыя горнарабочых, занятых у сярэдня-нямецкай вугольнай прамысловасьці, аднагалосна адхіліла пастанову арбітражнае камісіі, якая прадугледжвала 10 з пал. гадзінную і 11-гадзінную зьмену. Пры рэфэрэндуме, праведзеным нямецкім саюзам горнарабочых на пытаньні аб даўжыні рабочага дню, 90 проц. вуглякопаў Сярэдняе Нямеччыны выказаліся за ўвядзеньне 8-мігадзіннае зьмены ў капальнях замест існуючае ў сучасны момант 12-цігадзіннае зьмены.

Трацейская камісія, разьбіраўшая канфлікт пасьля рэфэрэндума, ухваліла пастанову аб замене 12-ці гадзіннае зьмены—10 з пал. і 11-ці га-

У САЮЗНЫХ РЭСПУБЛІКАХ.

ЯШЧЭ АДНО ДАСЯГНЕНЬНЕ.

Пуск Зема-Аўчальскае гідра-электрастанцыі.

ТЫФЛІС, 26-IV. (Тэрміновая). Сёньня ўвечары распачалася рэгулярная падача току з Зема-Аўчальскае гідраэлектрычнае станцыі ў Тыфліс. У першы дзень на ток станцыі пераведзена гарадзкая асьвятляючая сетка ў райёне. У працягу тыдню да 1 мая паступова ўсе райёны Тыфлісу таксама будуць пераведзены на ток Зема-Аўчальскае станцыі. Два тыдні будзе цягнуцца выпрабаваньне станцыі, а пасьля праца тыфлісскіх электрастанцый будзе спынена, і Зема-Аўчальская станцыя распачне сваю працу.

НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ЦЭНТРАЛЬНЫХ І МЯСЦОВЫХ ГАЗЭТ.

Даклад прадстаўніка РСІ аб заганах у асьвятленьні кампаній у друку.

МАСКВА, 27-IV. 22-га красавіка зачынілася нарада рэдактароў цэнтральных і мясцовых газэт пры адзеле друку ЦК УсеКПБ(б). На заключным пасяджэньні быў заслухан даклад намесьніка наркома РСІ т. Якаўлева. Дакладчык бачыць у асьвятленьні нашым друкам кампаній па рэжыму эканоміі і барацьбе з бюракратызмам дзьве галоўныя хібы.

Першая—асаблівае разьмеркаваньне між газэтамі аб'ектаў крытыкі. Павятовая газэта усю крытыку накіроўвае на воласьць, на вёску. У цэнтры ўвагі губэрскае газэты ізноў такі воласьць і вёска і менш павет. Цэнтральныя газэты вельмі рэдка пішуць пра справы губэрскія, часьцей пра павятовыя і яшчэ часьцей пра пытаньні воласьці і вёскі. З гэтае прычыны ў нашым друку пераважае выкрыцьцё балячак воласьці і вёскі, і вельмі мала крытыкі працы кіруючых зьвеньняў (губэрскіх і цэнтральных) нашага апарату.

Другая хіба—гэта за-шмат фэльлетоннасьці. Адным фэльлетонам з посьпехам змагацца з бюракратызмам нельга.

Трэці момант, які зьяўляецца таксама вялікім недахватам друку, гэта значны лік агульных артыкулаў, агульных месц.

Галоўным пытаньнем у працы друку і зьяўляецца прывесьці газэтную зброю ў адпаведнасьць з вялікаю задачаю, якая стаіць перад намі, Другою абавязковаю ўмоваю зьяўляецца рашучае ўцягненьне мас у справу барацьбы за рэжым эканоміі.

Нарэшце, друк павінен ня толькі выкрываць, але і паказваць на прыкладзе добрых гаспадарцаў, добрых каапэратараў, як трэба працаваць як трэба праводзіць рэжым эканоміі.

Удзел прафарганізацый у сьвяткаваньні Дню Друку.

МАСКВА, 27-IV. УЦСПС разаслаў месцам абежныя зазначэньні аб сьвяткаваньні «Дню Друку» 5-га мая. Прафарганізацыі павінны ўзяць актыўны ўдзел у сьвяткаваньні пралетарскага друку ў дзень 5-га мая. а таксама адзначыць спэцыяльна ролю прафсаюзнага друку ў барацьбе за дыктатуру пралетарыяту, за ўзмацненьне прафэсыянальнае сувязі, за арганізаванае згуртаваньне мас наваколь будаўніцтва сацыялізму. Сьвяткаваньне «Дню Друку» у залежнасьці ад мясцовых умоў можа быць праведзена ў які-небудзь іншы дзень, але не пазьней 16-га мая.

ЗАДАНЬНЕ ПА С.-Г. ПАДАТКУ ВЫКАНАНА.

МАСКВА, 27-IV. 1-га красавіка скончыўся тэрмін выплаты сельскагаспадарчага падатку за 1925-26 год. Да гэтага тэрміну па СССР выплачана 101,7 проц. гадовае сумы падатку.

ПАЧЫНАЕЦЦА ПРАКЛАДКА ТУРКЕСТАНА-СІБІРСКАЕ ЧЫГУНКІ.

МАСКВА. Гэтымі днямі адбылося пасяджэньне камітэту дапамогі пабудове Туркестана-Сібірскай чыгункі. Камітэт пастанавіў, што сёлета павінна быць скончана пракладка ня менш 150 клм. шляху ад Сяміпалацінска ў напрамку на Сэргіёпаль.

ПРАЕЗД ПРАЗ МАСКВУ ЯПОНСКАЕ ЭКАНАМІЧНАЕ ДЭЛЕГАЦЫІ.

МАСКВА, 27-IV. Праездам у Жэневу ў Маскве спыніліся ўдзельнікі міжнароднае эканомічнае канфэрэнцыі ў Жэневе: японскі дарадца гэтае канфэрэнцыі прафэсар Сато і Хасулі—сэкратар японскага міністэрства земляробства і дарадца японскага цэнтральнага каапэрацыйнага саюзу. Яны паведаліся ў Цэнтрасаюз, дзе знаёміліся з арганізацыйнымі прынцыпамі савецкае каапэрацыі і яе працаю.

ЧАКАЕЦЦА ЗЬМЕНА НАДВОР'Я.

ЛЕНІНГРАД. Геафізычная абсэрваторыя паведамляе, што пачынаючы з 27-га красавіка па ўсёй эўрапэйскай частцы СССР, апроч паўднёвага заходу распачнецца павышэньне тэмпэратуры. На паўночным захадзе чакаюцца дажджы.

Омскі пралетарыят на дапамогу кітайскім рабочым.

ОМСК. На шэрагу прадпрыёмстваў рабочыя і служачыя адлічылі адзін процант на карысьць кітайскіх рабочых.

Сход упаўнаважаных транспартнае спажывецкае каапэрацыі вылучыў 1.000 руб. ахвярам шанхайскага расстрэлу.

Лёдаход на Волзе.

САРАТАЎ. На Волзе суцэльны лёдаход. Вада хутка прыбывае прыблізна на 1 метру ў суткі. Проці гораду лёдам была раздушана лодка з 4 лодачнікамі. Лодачнікі загінулі.

* * *

НІЖНІ-НОЎГАРАД. На ўсім працягу Волгі і Акі распачалася навігацыя.

Англа-францускае зблiжэньне.

ВЕНА, 26-IV. Будапэшцкая «Пэстэр Лёйд» сьцьвярджае, што за апошні час намецілася зблiжэньне між Англіяй і Францыяй. Аднакі гэтага газэта бачыць у супольных кроках, якія Англія і Франція зрабілі ў Рыме, каб схіліць Італію да мернасьці ў адносінах да Югаславіі.

«Намеры Францыі ісьці супольна з Англіяй у Кітай паказальны—піша газэта,—бо Францыя баіцца, што разьвіцьцё нацыянальна-вызваленчага руху ў правінцыі Юнань адаб'ецца на Інда-Кітаі.»

ВЫНІКІ ВЫБАРАЎ Ў АЎСТРЫЙСКІ ПАРЛЯМАНТ.

Лік мандатаў узрос у аграрыяў і сацыял-дэмакратаў.

ВЕНА, 26-IV. У парлямацкіх выбарах у Аўстрыі брала ўдзел 3.600.000 чал век. Сацыял-дэмакраты атрымалі 1.530.000 галасоў, аб'яднаны блёк хрыстыянскіх сацыялістаў і пан-немцаў 1.830.000 галасоў, ляндбунд (аграрыі) 224.000 галасоў.

Хаця кампартыя страціла ў Вене палову галасоў, аднак у Карынтыі колькасьць паданых за кампартыю галасоў павялічылася ў параўнаньні з папярэднімі выбарамі ў тры разы і дасягла 17 проц. агульнае колькасьці галасоў, паданых у гэтай вобласьці. Па ўсёй Аўстрыі кампартыя атрымала 16.500 галасоў (проці 18.000 галасоў на выбарах 1923 г.) пры гэтым належыць улічыць каля 2.000 галасоў, атрыманых кампартыяй на папярэдніх выбарах у Сярэдняй Штырыі і Бургенляндзе, дзе пры сучасных выбарах кандыдацкія сьпіскі кампартыі ня былі дапушчаны.

Разьмеркаваны мандаты ў новым парляманце так: аб'яднаны сьпіс хрыстыянскіх сацыялістаў і пан-немцаў—85 мандатаў, сацыял-дэмакратаў—71, ляндбунд—9 мандатаў. Сацыял-дэмакраты выгрываюць па ўсім краі 3 мандаты, ляндбунд—4.

Такіх чынам у новым парляманце ўсе буржуазныя партыі разам мелі ў параўнаньні з сацыял-дэмакратамі большасьць у 29 галасоў. У новым парляманце ўсе буржуазныя партыі разам будуць

У панскай Польшчы.

Забастоўка ў Дамброўскім басэйне.

У сувязі з канфліктам між адміністрацыяй капальні «Банкова» і рабочымі-гарнякамі на грунце звальненьня з працы некалькіх рабочых, у капальні «Банкова» забаставала 2000 гарнякоў.

На другі дзень да забастоўкі далучыліся рабочыя капальні «Гамнэр».

Працэс 40 украінскіх сялян.

Закончана следзтва па справе 40 украінскіх сялян, арыштаваных у сьнежні мінулага году па абвінавачаньні ў «процідзяржаўнай» дзейнасьці.

Разгляд гэтай справы адбудзецца ў канцы красавіка ў Кракаўскім акруговым судзе і працягнецца некалькі тыдняў.

Справа будзе слухацца пры зачыненых дзьвярох.

Усё яшчэ „выкрываюць“.

Віленская палітычная паліцыя «выкрыла» гэтымі днямі «процідзяржаўную» арганізацыю.

Арыштавана 9 чал. у той лічбе 5 жанчын.

Канфіскацыя беларускае газэты.

У Вільні канфіскаваны № 6 беларускае газэты «Наша Справа».

Прычына канфіскацыя артыкулы: «Трагедыя Польшчы», «Нацыянальная сьвядомасьць і шавінізм» і верш «Беларуская калыханка».

Рэдактар газэты прыцягнуты да судовае адказнасьці.

Вызваленьне Коўша.

Адзін з кіраўнікоў беларускага каапэрацыйнага банку ў Вільні — Коўш, які быў арыштаваны адначасова з дэпутатамі Беларускае Грамады,—вызвалены з пазнанскае турмы «Вронкі» пад заклад у 3000 злотых.

Рэкордны палёт на хуткасьць.

ВАРШАВА, 25-IV. Лётнік Дмошчынскі на пасажырскім апараце кампаніі паветраных зносін «Аэролёт» зрабіў пералёт на хуткасьць з Варшавы ў Лодзь. Адлегласьць у 120 клм. Дмашчынскі праляцеў у 28 хвілін з сярэдняй хуткасьцю каля 250 клм. у гадзіну.

Фашысцкі „парлямантарызм“.

(З польскага друку).

За апошнія гады правыя польскія партыі некалькі раз высоўвалі пытаньні аб зьмене выбарчага законадаўніцтва. Па тых, ці іншых прычынах, але сойм яшчэ ніколі не разглядаў гэтага пытаньня. Галоўнаю перашкодай таму былі супярэчнасьці ў поглядах розных партыяў. Эндэкі, напрыклад, хацелі-б зьмяніць выбарчае законадаўніцтва ў тым напрамку, каб выбары ў будучы сойм далі эндэцкую большасьць.

Паводле эндэцкага праэкту кандыдатурам у сойм ставіліся пэўныя патрабаваньні з боку адукацыі, узросту і маемасьці. Іншыя правыя польскія партыі падтрымлівалі гэты праэкт, але правесьці яго праз сойм нельга было, бо проці яго выступалі «Пяст» пэпэсы, НПР і інш.

Пасьля майскага перавароту, калі сойм зацьвердзіў некаторыя зьмены канстытуцыі (павялічэньне ўлады прэзыдэнта), правыя польскія партыі зноў паставілі пытаньне аб зьмене выбарчага законадаўніцтва. Прапазіцыя правых партыяў і на гэты раз не разглядалася дзеля адмоўнага становішча большасьці сойму ў тэй лічбе і пэпэсаў, якія выступалі як «абаронцы» польскае «дэмакратыі».

28-га красавіка г. г. адбудзецца чарговае пасяджэньне сойму і на ім зноў ставіцца пытаньне аб зьмене выбарчага законадаўніцтва. На гэты раз справа не выглядае безнадзейнаю. Большасьць польскіх партыяў ужо «сьпелася» і выступае амаль што адзіным фронтам.

«Жэчпосполіта» № 105 праводзіць анкету між правадырамі і лідэрамі розных польскіх партыяў па пытаньні аб зьмене выбарчага законадаўніцтва.

Дэпутат хрысьціянска-дэмакратычнае партыі Блажаевіч адказвае, што ў сучасным сойме польская насельнасьць мае ў сойме

параўнаўча надта малую колькасьць прадстаўнікоў. У сойме далёка лепш прадстаўлены нацыі, якія знаходзяцца на надта вялікім культурным узроўні з надта слаба разьвітым дзяржаўным пачуцьцём.

Першая зьмена, якую трэба зрабіць у нашым выбарчым законадаўніцтве—гэта забясьпячэньне насельнасьці цэнтральнае Польшчы і Заходніх крэсаў большага прадстаўніцтва ў сойме.

У зьвязку з апазіцыяй лявіцы і нацыянальных меншасьцяў, няжка сказаць які лёс спаткае распачатую працу па зьмене выбарчага законадаўніцтва. Адно ёсьць толькі пэўным. Трэба як мага старацца, каб сучасны сойм зацьвердзіў зьмену выбарчага законадаўніцтва. Якое выбарчае законадаўніцтва—такі і сойм.

Намесьнік старшыні кулацкае партыі «Пяст»—Уладыслаў Кернік, на пытаньне анкеты, спачатку шмат гаворыць аб тэй непачэснай ролі, якую выконваў сучасны сойм.

Сучасны сойм страціў сваё права існаваньня ад моманту майскага перавароту, калі сойм не патраціў процідзейнічаць гэтаму перавароту і стаць на пазіцыю абароны правапарадку.

Канчаючы свой адказ, Кернік падкрэсьлівае, што толькі будучы сойм, які будзе выбраны на падставе зьменанага выбарчага законадаўніцтва

— вывядзе парлямантарызм з тэй цеснае вуліцы, куды закінула яго разьюшанае партыйніцтва пэўных партыяў і майскі пераварот.

Адзіным апраўданьнем існаваньня сучаснага сойму можа быць толькі імкненьне да выкананьня адной задачы—зьмены выбарчага законадаўніцтва, праз што мы атрымаем магчымасьць выбраць лепшы (!) сойм.

Нічога дзіўнага, што правыя польскія партыі імкнуцца да зьмены выбарчага законадаўніцтва, якое запэўніла-б «лепшае прадстаўніцтва ў сойме для польскай насельнасьці». Інакш кажучы, запэўніла-б правым польскім партыям значную перавагу ў будучым сойме. Але цікава паслухаць, што адказвае на пытаньне анкета гэт. зв. соймавая «лявіца».

Старшыня нацыянальнай рабочай партыі (НПР)—Попель даводзіць, што

рэформа выбарчага законадаўніцтва настолькі патрэбна, што гэта павінен вразумець кожны прыхільнік парлямантарызму. Дзеля гэтага мы ня можам згадзіцца з адмоўным становішчам некаторых лявіцовых партыяў па гэтаму пытаньню.

Каб пагадзіць польскія правіцу і «лявіцу», нацыянальная рабочая партыя высоўвае свой праэкт зьмены выбарчага законадаўніцтва, з якім, быццам, павінны згадзіцца ўсе польскія партыі.

Гэты праэкт—праўду кажучы—зьяўляецца ультракэмпрамісавым, які пры добрай волі можа быць праведзены праз сойм.

Паводле гэтага праэкту выбарчае законадаўніцтва ў цэнтры дзяржавы і на Захадзе зусім ня зьменіцца і толькі паменшыць лік мандатаў на Усходзе.

Сваім праэктам НПР хоча скасаваць усе супярэчнасьці, якія існуюць між польскімі партыямі на пытаньні аб выбарчых правах, бо суадносіны між польскімі партыямі ад гэтага ня зьменяцца і ў будучым сойме будзе павялічана колькасьць польскіх дэпутатаў, коштам заходня-беларускай і заходня-украінскай насельнасьці.

Магчыма, што з гэтым праэктам згодзяцца ўсе польскія партыі, не выключаючы і «заўзятых абаронцаў» парлямантарызму—пэпэсаў.

Што тычыцца беларускай і ўкраінскай насельнасьці «Усходніх крэсаў», ім да гэткага ўціску і зьдзекаваньня ўжо ня прызвычайвацца. Але ўсе гэтыя махінацыі польскіх нацыяналістычных партыяў толькі лішні раз выяўляюць сапраўдную сутнасьць фашысцкага «парлямантарызму».

Юг.

Злачынны аптымізм.

(Ад уласнага карэспандэнта).

З толькі-што адбыўшымся актам падпісаньня італа-вэнгерскага ўгавору, Італія, можна сказаць, скончыла справу палітычнай ізаляцыі Югаславіі. Гэтым жа ўгаворам адначасова нанесены ўдар і кааліцыі, гэтак званай Малай Антанты. І тым ня менш было-б вялікай памылкай думаць, што італа-вэнгерскі пакт азначае сабой і канец італьянскай палітычнай гульні, хоць, здавалася-бы, Мусаліні поўнасьцю дабіўся, чаго хацеў. Яго печаканае і сьмелае ўтаржэньне ў Албанію, для падтрыманьня жаданага яму ўраду Ахмеда Зогу, ні з якога боку пратэсту не спаткала. Пратэставалі-ж толькі супроць спробы ўзброенага паскоку на Сэрбію, але зусім ня проці бескантрольнага гаспадараньня італьянцаў у Албаніі, дзе адгэтуль увесь тэхнічны апарат кіраўніцтва згуртаваны ў руках афіцэраў і інжэнэраў з Італіі.

З уступленьнем у жыцьцё італа-вэнгерскае згоды балканская чахарда ня толькі ня скончылася, але ўскладнілася. Да гэтай пары агрэсыўнасьць аднаго Мусаліні, а цяпер у яго ёсьць Ботлен і Аверэску, якія таксама маюць свае рахункі з Сэрбіяй і Чэхя-Славакіяй і чакаюць толькі выпадку, каб з імі разрахавацца. Аб чым іменна марыць Румынія—дакладна невядома, але пляны Вэнгрыі складаюцца з таго, каб адабраць ад Югаславіі Банат і Бачку, а ад чэхаў—Прыкарпацкую Русь.

Газэты даўно скончылі з італа-сэрбскім канфліктам і здалі яго ў архіў гістарычнай хронікі. Нават эўрапейскія дыпляматы не гавораць больш аб ім, бо гэта ўсё людзі лёгкадумна-злачынага аптымізму. Аптымізм—іх фундамант. Але, калі зірнуць у канцэлярыю належных міністэрстваў, можна бачыць, што міністэрскія машынкі выстукваюць зусім не аптымістычную мэлёдыю. Італа-сэрбская хвароба загнала ў сярэдзіну, але ня зьнішчана. Зьнішчана яна можа быць толькі тады, калі дагаворацца паміж сабою Рым і Белград. А да той пары палітычная сытуацыя тут застанецца нязьменнай і небясьпека балканскай вайны таксама блізка, як і раней, бо зямежная палітыка Мусаліні рухаецца на старых напрамках крайнасьцяў і адважнай рызыкі.

З аднаго боку, рымскі дыктатар шукае сусьветнага першынства, а з другога, разраджэньне атмасфэры ўнутравага напружаньня. Як тое, так і другое, мае свае карані ў вайне. І колькі-б эўрапейская буржуазная прэса ні трубіла аб тым, што „на Шыцци ўсё спакойна“, верыць ёй ніяк не дазваляе рэальнае становішча рэчаў. Што балканскія гураганы выбухаюць сыстаматычна і таксама сыстэматычна тухнуць, яшчэ ня значыць, што яны не хаваюць у сабе нічога небясьпечнага і ад іх кожна адмахнуцца, як ад старога, абрыдзеўшага перапеву.

Калі да гэтага часу не дайшло да ўзброенай стычкі, дык толькі таму, што фашысцкая Італія вельмі раскідвалася. Яна, так сказаць, займалася намацваньнем і вышукваньнем, высьляняючы найбольш слабы бок ворага. Цяпер пэрыяд вышукваньняў скончаны, расцярушаныя на розных напрамках натугі, згуртаваны ў адно пэлае, месца ўдара знойдзена, засталося толькі натрапіць на адпаведны момант. Гэта, мусіць, адзіная перашкода. Але пры імпульсыўнасьці Мусаліні і яна нарэшце сурёзнай перашкоды прадстаўляць ня можа. Адзінага, чаго яшчэ ў партфэлі рымскіх фашыстаў не хапае, гэта маральнага падтрыманьня з боку Нямеччыны. Мусаліні вельмі не падабалася, што ў час апошняга канфлікту ў Бэрліне, вялі сябе з выключным тактам і вартасьцю пэйтр. краіны.

Гэта акалічнасьць закранула фашыстаў за жывое, і яны парашылі, чаго-б гэта ні каштавала, дамагчыся дружбы і падтрыманьня нямецкай дыпляматы. З гэтай мэтай увесь фашысцкі друк, як на заказу, арганізаваў нядаўна кампанію за прыяцельскі ўгавор з Нямеччынай. Штрэзэману, які прыяжджае сюды ў хуткім часе „для лячэньня“, рыхтуюць урачысты прыём. Злыя языкі, між іншым, гавораць, што рымскім гасьцівіцам дадзена распараджэньне не здаваць Штрэзэману пакояў і гаварыць, што «ўсё занята», бо нямецкаму міністру замежных спраў фашыстыя падрыхтавалі цэлую віду на дзяржаўны кошт, г. зн. дарэмна.

Бясспрэчна, Мусаліні ўжыве ўсе сродкі, каб прыезд Штрэзэмана абярнуць у дэманстрацыю палітычнай прыязьні паміж Нямеччынай і Італіяй. Гэтым рымскі дыктатар думае адначасова двух зайцаў забіць: і Балканы застрашыць, і самалюбства Францыі абразіць. Пытаньне толькі ў тым, ці згодзіцца на гэткую дэманстрацыю сам Штрэзэман, які вельмі даражыць прыхільнасьцю Брыяна. Ва ўсякім выпадку нямецкая прэса вельмі рашуча паўстае проці наданьня паездцы Штрэзэмана на Італіі палітычнага характару.

Гутаркі аб італа-нямецкім пакце мусіруюцца ў Італіі ўжо даўно. Аб ім гутарылі яшчэ ў мінулым годзе. Але падпісаньню ўгавору ніяк ня спрыяла абстаноўка. Вельмі магчыма, што і на гэты раз нічога ня выйдзе, затым, што палітычная канюнктура моманту зусім не такая, каб можна было рэальна ўявіць сабе Нямеччыну ў ролі прыхільніцы італьянскага фашызму. Францыя гэтага не пацерпіць. А для Нямеччыны куды важней, пакуль што, раўняцца не на Рым, а на Парыж. У даным выпадку прыказка—„усе шляхі вядуць у Рым“ прымушана будзе пацярпець паражэньне.

Рым. І. Паляшчук.

У САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ.

Перад сяўбой.

(Шклоўскі р., Магілеўшчына).

У аснову ўсёй працы па правядзеньню сяўбы гэтага году райвыканком кладзе мерапрыёмствы, дапамагаючыя разьвіцьцю сельскай гаспадаркі ва ўсіх яе галінах.

Агульная пасеўная плошча ў вясеньнюю сяўбу гэтага году павялічыцца на (1,34 проц.).

Плошча яравога кліну ў гэтым годзе павялічыцца на 1530 дзесяцін (6,82 проц.) супроць мінулага году.

З пашырэньнем яравога кліну павялічыцца, галоўным чынам, плошча пад травасеяньнем бульбай, тэхнічнымі культурамі і часткай пад вікай і аўсом, як культур, дапамагаючых росту і інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі.

Недарод мінулага году адбыўся, галоўным чынам, па недахвату кармоў, што прымушае зьвярнуць асаблівую ўвагу РВК і на пашырэньне плошчы пад травасеяньнем. Гэта дасьць магчымасьць паслабленьня штогоднай вастраты кармавога голаду.

Райвыканком ставіць сваёй задачай давесьці пасеў вікі да 1500 дзес. (мелася летась 1401 дзес.), з павялічэньнем на 7,06 проц., а пасеў капюшыны да 950 дзесяцін, (у 1926 г. было 803,2 дзес.); што дае павялічэньне на 18,3 проц.

Патрэбнасьць насеньня вікі ў сувязі з недародам яе—будзе здаволена галоўным чынам, увозам з-за меж райёну і акругі праз с.-г. крэдытнае таварыства ў колькасьці 1100 пудоў. Капюшыны, акрамя мясцовай, увозіцца ў райён 400 пуд. Пасеў бульбы мяркуецца пашырыць да 4200 дзес. (павялічэньне на (16,94 проц.).

Сёлета будзе праведзена праца па праверцы раней уведзенага шматпольля ў гаспадарках камхозаў і пасёлкаў. Акрамя таго, ставіцца мэтай высьветліць тыя земляўпарадкаваныя пасёлкі, у якіх ня ўведзены, альбо ня прывіліся шматпалёвыя севазвароты, вывучаючы пры гэтым асаблівасьці гэтакіх.

Сяргей Лодысеў.

Дзе мы даб'ёмся вырашэньня?

(В. Дзехцяроўка, Заслаўская р., Менскай акругі).

У апошнія часы ў нас бязьлітасна пачалі высякаць лес с мясцовага значэньня. Дзе 18-ці пнёў у дзялянцы не хапае, а дзе 20 ці 30 і гэтак амаль-што кожны дзень. Усё гэта распачалося з таго, што пасёлачнікі пасёлку «Красная Звезда», якія маюць ужо добрыя свае будынкі, летась восеньню самавольна, ня гледзячы на папярэджаньні ўпаўнаважаных, высеклі звыш 500 пнёў стравядо і дравянога лесаматар'ялу, які і па сёньняшні дзень ляжыць у пасёлачнікаў і гніе.

Сёлета-ж таксама гэтыя пасёлачнікі атрымалі ў дадатак з сельсавету, каапэрацыі, КСУ таксама нешта мусіць пнёў па 20, або і больш. І некаторыя пачалі нават спэкуляваць лясным матар'ялам.

Гледзячы на гэтыя непарадкі, зараз і ўсе сяляне пачынаюць самавольна сеч, грунтуючыся нам тым:

— Калі сеч, дык сеч, а горшых і лепшых не павінна быць.

Райвыканком павінен гэту справу найхутчэй вырашыць, бо хутка ў нас і пянька не застанецца.

Юр.

Узышлі на гаспадарчыя рэйкі.

Што лепш—пасёлак ці хутар?

(Г. Горкі, Арш. акругі).

Горацкі райён з земляўпарадкаванай плошчы налічвае 85 проц. «сталыпінскіх» хутароў (да агульнай плошчы райёну—60 проц.) і 15 проц. пасялковага землякарыстаньня.

Ня гледзячы па тое, што шмат ужо казалася аб нераважнасьці і большай карысьці пасёлкаў за хутары, усё-ж ёсьць яшчэ цяга часткі сялян да хутароў, хоць, праўда, большасьць хутаран просіцца ізноў у «купу» у вёску.

Горацкі райком КПБ зараз намеціў агляд 10-ці пасёлкаў і 7-мі хутароў з мэтай выяўленьня росту гаспадаркі пасялковай і хутарской і мажлівасьцяў росту.

Дзеля агляду намечаныя пасёлкі і хутары земляўпарадкаваныя ў адзін год з аднолькавым лікам едакоў у хаце (колькі ў хутарской тольлі-ж і ў пасялковай), а знача і аднолькавым надзелам на 1 двор.

Вынікі практычна скажуць, што лепш—хутар, ці пасёлак.

Пасьля агляду будуць падведзены вынікі на спэцыяльна склікаемай на 8-га мая нарадзе сялян пасялкоўцаў і хутаран.

На нарадзе будзе прысутнічаць каля 200 сялян—ад 5 двароў 1 чал.

Акрамя падвядзеньня вынікаў агляду хутарскіх і пасяльковых гаспадарак, нарада намеціць практычныя мерапрыёмствы па палепшаньню сельскай гаспадаркі райёну.

На нараду запрашана прафэсура і ўсе навуковыя сілы сельска-гаспадарчай акадэміі.

Ул. Паскрэбка.

На шыі беднякоў і заможныя праяжджаюць.

(С. Расасна, Дубровенскага райёну, Аршаншчына).

Ужо доўгі час цягнецца неразьбярыха па земляўпарадкаваньню с. Расасны.

Праўда, зямлю так-сяк разьмеркавалі, а цяпер на чарзе дню стаіць іншае пытаньне, як лепей сабраць грошы за земляўпарадкаваньне.

А мы бачым, што шмат ёсьць заможных сялян, якія, мусіць, і ня думаюць плаціць. Бядняк жа, наадварот, стараўся, каб як небудзь унесьці грошы і беднякі па большасьці сваё выканалі.

Бедняку даўно ўжо надаела трохпалёўка і ён хутчэй хоча вырвацца з яе ланцугоў.

Што-ж робяць упаўнаважаныя, калі іх у сваю чаргу цягне акраз?

„СОРОК ПЕРВЫЙ“?

У сялянскім унівэрсытэце.

Першыя заявы. — За два дні 130 заяў.

(Ворша).

Справу укамплектаваньня сялянскага унівэрсытэту (які адчыняецца 1-га мая пры с.-г. Акадэміі ў Горках) узяў на сябе райком партыі. Прыём заяў распачаўся з 17-га красавіка. Аб вялікай зацікаўленасьці сялянства гэтым унівэрсытэтам сьведчаць 130 заяў, паданых ад сялян за 2 дні. Зараз лік заяў, бязумоўна, большы. З паданых заяў значны лік ад дарослага сялянства. Акрамя гэтага, на імя унівэрсытэту дасылаюцца штодня лісты з другіх акругаў, з просьбай паведаміць аб умовах паступленьня ў сялянскі унівэрсытэт.

Згодна ранейшых паведамленьняў—мелася на мэце спачатку прыняць 50 слухачоў, але лік гэты павялічаны да 100. Унівэрсытэт будзе працаваць і ў летку—у сувязі з тым, што пры Акадэміі мажліва будзе праводзіць практычныя заняткі (фэрма, сад, поле, як правільна засяваць, наглядаць за пасевамі і г. д).

Рэктарам унівэрсытэту вызначаны праф. Красінаў.

Ул. П-ка.

Праца сельсавету ажыла.

(В. Лошніцы, Барысаўшчына).

Лошніцкі сельсавет у мінулым годзе працаваў зусім дрэнна,—камісіі ня толькі не працавалі, але і не існавалі. Шмат было недарэчнасьцяў у працы самога сельсавету і нават былі растраты дзяржаўных і грамадзкіх грошай, былі выпадкі, калі складаліся фальшывыя акты па страхоўцы.

Пасьля апошніх перавыбараў вусім іншы малюнак.

Трэба сказаць, што сам сельсавет абнавіўся на 75 процантаў,—у сельсавет абраны партыйцы, камсамольцы і лепшая частка беднякоў.

Працуе сельсавет запрацавалі і розныя камісіі.

Культасьветная камісія з'арганізавала драмгурток і часта адбываюцца спэктаклі, якія прыцягваюць шмат сялянства; праводзяцца розныя лекцыі і гутаркі; вядзецца праца па распаўсюджваньню газэт. Наогул, культасьветная камісія цесна зьвязалася з нардомам і разам з ім праводзіць усю культасьветную працу.

Працуе таксама і санітарная камісія: праведзена абследаваньне калодзежаў і мясцовых устаноў, прыняты крокі да зьліквідаваньня ўсіх недахватаў. Пры дапамозе мэдыцынскіх сіл чытаюцца таксама лекцыі на розныя тэмы, маючыя сувязь з палепшаньнем санітарнага становішча вёскі і г. д.

Запрацавала таксама і камісія дабрабыту: пакуль што арганізавана пажарная дружына, у якую ўваходзе да 30 чалавек. Вядзецца праца па нарыхтаваньню пажарнага інвэнтару,—маецца на ўвазе к 1 мая пабудаваць 2 пажарныя бочкі і 2 двухколкі, пажарная машына ёсьць.

Ідзе па сельсавету таксама падрыхтоўчая праца да сяўбы,—працуюць з поўнай нагрузкай зернаачысьціцельныя машыны, праводзяцца гутаркі і лекцыі на прадпасеўныя тэмы і г. д.

Наогул трэба сказаць, што ў параўнаньні з мінулым годам праца сельсавету ажыла і становіцца на пэўны шлях.

В. З—ў.

Ашчадная справа ў Мазыршчыне.

Праца па прыцягненьню сродкаў насельніцтва ўкладнымі апэрацыямі значна разгарнулася за апошнія часы.

Так, па вестках цэнтральнай касы ашчаднасьці маюцца наступныя дасягненьні: ня гледзячы на памяншэньне ліку кас на акрузе (з 19 на 1-X-1926 г., да 17 на 1-IУ-1927 г.), колькасьць укладаў павялічылася на 883 і агульная колькасьць сродкаў на 40944 р., на 1-IУ-27 г. налічваецца па касах ашчэднасьці 85142 р.

Укладчыкі па сацыяльнаму становішчу разьмяркоўваецца: рабочых 128, сялян 380, служачых 824, саматужнікаў 95 і іншых 218.

Па касе ашчэднасьці аддзяленьне дзяржаўнага банку маецца на красавік месяц г. г. 69 укладаў на суму 28983 руб. 64 к. Рост укладаў ідзе бязупынна як за лік павялічэньня колькасьці ўкладчыкаў (за 6 месяцаў на 157 проц.), так і за лік павялічэньня сярэдняга разьмеру самага ўкладу (з 292 р. да 644 р. на кожнага ўкладчыка).

Па сеці спажывецкай каапэрацыі да кастрычніка 1926 г. ўклады мелася ў 16 таварыствах на суму 9025 руб., на красавік маецца ўжо ў 24 спажывецкіх таварыствах 9955 р.

Па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі на красавік месяц маецца ўкладаў 681 р. (сюды не ўваходзяць уклады ўстаноў) на суму 15923 р., укладаў ад розных устаноў і арганізацый на суму 7748 руб. У параўнаньні з становішчам на кастрычнік месяц 1926 году маецца па лініі сельска-гаспадарчай каапэрацыі памяншэньне ўкладаў, што тлумачыцца тым, што раней на рахунак укладаў заносіліся пераходзячыя сумы ў відзе атрыманых авансаў ад сялян на пакупку машын і г. д., чаго няма ў сучасны момант.

З прыведзеных даных відаць, што ў гэтым напрамку была праробленa значная работа, але трэба адзначыць, што магчыма яшчэ шмат зрабіць у напрамку большага прыцягваньня сродкаў насельніцтва. Растлумачэньне сярод насельніцтва праведзена яшчэ слабае, некаторыя арганізацыі адносяцца і дагэтуль да справы ашчаднасьці бяз усякай увагі.

Ёсьць яшчэ цэлы шэраг кас, якія нічога не зрабілі дзеля таго, каб разгарнуць працу сярод насельніцтва, а таксама трэба падкрэсьліць, што на заводах гэта работа пакуль што вядзецца вельмі слаба.

Б. Ш.

Весткі з месц.

Лубін у крэдыт.

Віцебск. Цэнтраземіскладз атрымаў насеньне лубіну для разьмеркаваньня сярод сялянства. Лубін адпускаецца ў крэдыт тэрмінам да двох гадоў як візавым каапэратывам, так і асобным сялянам.

Карціна Сальватора Роза.

Віцебск. З г. Полацку прывезена ў Віцебскі музэй карціна «Побіеніе камнямі Стефана». Карціна гэта (як лічаць, работы вядомага італьянскага мастака Сальватора Роза, які жыў у 17 стагодзьдзі) зьяўляецца самай каштоўнай карцінай у Беларусі.

Кіно-перасоўкі ва ўсіх райёнах.

Рэчыца. Усе райёны акругі атрымалі кіно-перасоўкі. У м. Лоева ўстаноўлена стацыянарнае кіно ў спэцыяльна адрамантаваным будынку на 500 чал.

Дзіцячыя яслі ў вёсцы.

Магілеў. З 1-га ліпеня па вёсках акругі будзе адчынена 8 дзіцячых яслёў. Для падрыхтоўкі загадчыкаў яслёў акр. аддз. аховы здароўя адчыняе з 1-га мая 6-ці тыднёвыя курсы.

Крэдытаваньне беднаты.

Гомель. АВК даручыў с.-г. банку выдаць 22.400 руб. на крэдытаваньне ў сёлетнюю вясеньнюю сяўбу вясковай беднаты.

„СОРОК ПЕРВЫЙ“?

Да першага мая 1927 году.

(Матар'ялы для дакладчыкаў, рэкамендуемыя АПА ЦК КП(б)Б).

1. І-га мая 1927 г. сьвяткуецца пад знакам узмацненьня міжнароднай салідарнасьці рабочых, аб'яднаньня рабочых усіх краін проці новых нагроз справы міру з боку імпэрыялізму, пад знакам братэрскай салідарнасьці рабочай клясы і працоўных мас СССР з рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі Кітаю. Разам з тым, 1 мая павінна будзе зьявіцца дэманстрацыяй посьпехаў будаўніцтва сацыялізму ў СССР і яшчэ больш аб'яднаньнем рабочых і сялянскіх мас павокал саветаў і пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі для таго, каб перамагчы ўсе цяжкасьці на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

1-е мая 1927 г. адзначае яшчэ сабою да таго-ж 10-цігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі пры падтрыманьні міжнароднай рабочай клясы, якая вызваліла пралетарыят СССР ад улады капіталістаў і абшарнікаў.

I. І-е мая, як ступень да Кастрычніка.

2. Партыя бальшавікоў, узброеная да першамайскіх дзён 1917 г. «тэзісамі» Леніна аб „задачах пралетарыяту ў данной рэвалюцыі“, пасьпешна выкрывала буржуазею, імпэрыялістычную сутнасьць часовага ўраду, і згодніцкую палітыку Савета Рабочых Дэпутатаў, у якім бальшавікі былі яшчэ ў меншасьці.

Рабочыя масы расьлі палітычна не на днях, а па гадзінах. 13 (26) красавіка піцерскія рабочыя на мітынгах, прысьвечаных бягучаму моманту, ухвалілі пастановы з патрабаваньнем: а) скіданьня часовага ўраду; б) скančэньня вайны; в) неадкладнага абвяшчэньня тайных ваенных угавораў; г) арганізаваць Чырвоную гвардыю і ўзброіць народ; д) арабіць неадкладны захоп абшарніцкіх, удзельных і царкоўных зямель і інш.

3. Напярэдадні 1-га мая 1917 г. Мілюкоў і Гучкоў абвясьцілі „вайну да канчатковай перамогі“ у поўным аб'яднаньні з саюзьнікамі. Сярод рабочых і салдат вялікае абурэньне: яны патрабуюць адстаўкі Часовага ўраду. У дэманстрацыі прымае ўдзел увесь петраградзкі гарнізон, салдаты ў поўным узброеньні. Праз 2 дні (3 і 4 мая) крывавыя стычкі паміж пралетарыятам, юнкерамі і студэнтамі, 4 мая міністры падалі ў адстаўку.

1-е мая 1917 г. такім чынам быў першым аглядам сіл рабочай клясы, якія сабраліся пад лёзунгамі бальшавікоў і ішлі да Кастрычніка.

4. Праз барацьбу з Часовым урадам сацыял-згодніцкі, які патураў „контр-рэвалюцыйным замашкам і спробам абшарнікаў і капіталістаў“ (Ленін), праз барацьбу з найбольш магутнымі дзяржавамі ў сьвеце, праз страшэнныя разбураньні, выкліканыя гаспадарчай разрухай, голадам, эпідэміямі—на працягу дзесяцігодзьдзя рабочая клясa, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пранесла сваю ўладу да новых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

II. Будаўніцтва сацыялізму ў СССР.

5. Дасягненьні на шляху сацыялістычнага будаўніцтва характарызуюцца ростам буйнай прамысловасьці («Толькі тады, калі краіна будзе электрыфікавана, калі пад прамысловасьць, сельсную гаспадарку і транспарт будзе падведзена тэхнічная база сучасная буйнай прамысловасьці, толькі тады мы пераможам канчатнова“. Ленін), узмацненьнем удзельнай вагі сацыялістычнага сэктара, агульным уздымам гаспадарчага жыцьця краіны, паступовым пераходам вёскі на больш культурныя інтэнсіўныя і калектывістычныя формы гаспадараньня (шматпольле, каапэраваньне сялянства, электрыфікацыя і г. д.) ростам капітальнага будаўніцтва, зьмякчэньнем таварнага голаду і г. д.

Некалькі ілюструючых лічбаў:

Удзельная вага індустрыі і сельскай гаспадаркі ў нашай краіне:

СССР

1923-24 г. сельск. гасп.	—54,7,	прам.	—45,3,
1924-25 г. » »	—45,0,	»	—55,0,
1925-26 г. » »	—41,7,	»	—8,3,

БССР

Сельск. гасп.	—82,5,	прам.	15,5
» »	—81,7,	»	18,3
» »	—77,7,	»	22,3

Рост дзяржаўнай прамысловасьці у 1925-26 г. у параўнаньні з 1924-25 г. па СССР на 40 проц. і па БССР на 42 проц. Павялічэньне капітальнага будаўніцтва (па СССР у 1923-24 г.—225 міл., у 1926-27 г. —947 міл. руб., а разам з электрабудаўніцтвам 1 мілярд 100 мілёнаў руб. Па БССР у 1925-26 г.—4.700 тыс. руб., у 1926-27 г.—7.900 тысяч руб.) Прадукцыя дзяржаўнай прамысловасьці дае павялічэньне ў 1926-27 г. проці напярэдняга году на СССР на 20 проц. у сярэднім, а па БССР на 24 проц. у сярэднім.

Лічбы вытворчасьці ўнутры краіны і ўвоза з-за граніцы сельска-гаспадарчых прыладаў і машын паказвае, як насоўваецца машынізацыя сельскай гаспадарні:

ГАДЫ:	Вытворчасьць унутры краіны.	Увезена з-заграніцы.	УСЯГО.
	у мілён. даваен. руб.		
1913 год	67,0	48,7	115,7
1923-24 год	16,8	6,2	23,0
1924-25 год	39,9	32,2	72.1
1925-26 год	68,0	51,5	119,5
1926-27 год	86,0	31,5	117,5

6. Побач з гэтымі буйнымі посьпехамі ёсьць і шэраг цяжкасьцяй на шляху далейшага сацыялістычнага будаўніцтва. Мы ўступілі ў новы пэрыяд гаспадарчага біўдаўніцтва, пэрыяд тэхнічнага перабудаваньня нашай гаспадаркі. Патрабны вялізныя сродкі для пераабсталяваньня нашай прамысловасьці і для яе далейшага разьвіцьця. Гэтых сродкаў нам капіталісты ў парадку пазыкі ў якой небудзь вялікай колькасьці не даюць. Нам прыходзіцца і прыдзецца насоўваць нашу прамысловасьць і транспарт за рахунак сваіх унутраных сродкаў, унутранага накапленьня.

7. Асноўнымі, найбольш сур'ёзнымі цяжкасьцямі, перашкаджаючымі нам прасоўвацца да сацыялізму, зьяўляюцца—усё яшчэ высокі ўзровень цэн на шэраг прамысловых тавараў, тэхнічная і арганізацыйная адсталасьць нашай вытворчасьці, бесправорнасьць і бюракратычныя скажэньні ў дзяржаўным апараце.

8. Камуністычная партыя назначыла выразную праграму мерапрыёмстваў па барацьбе з гэтымі цяжкасьцямі. Гэта—зьніжэньне цэн, якое ў сваю чаргу штурхае наперад справу рацыяналізацыі нашага гаспадарчага і дзяржаўнага апарату, а таксама прыцягненьне шырокіх мас працоўных да «масавых актыўных дзеяньняў у практычным вырашэньні гэтых пытаньняў», да кантролю і да «ўдзелу» у розных гаспадарчых разьліках, уцягваючы іх у барацьбу за танныя цэны, за ўвядзеньне тэхнічных і арганізацыйных палепшаньняў у вытворчасьці, і за выяўленьне і бязьлітаснае бічаваньне фактаў бюракратычных скажэньняў у нашым дзяржаўным апараце.

9. Аснаўная наша задача ў галіне палітыкі цэн складаецца в таго, каб за штуку тавара брацьтаньней, выраблянь лепшы тавар, павялічваць попыт спажыўца, узмацняць таваразварот, тым самым атрымліваць вялікую колькасьць прыбыткаў і паскараць тэмп нашага разьвіцьця, не натыкаючыся на разбураньне сялянства, не пазбаўляючы індустрыі аграрнай сыравіны, захоўваючы правільную прапорцыю паміж сельскай гаспадаркай і прамысловасьцю, робячы больш трывалым саюз рабочых і сялян, узмацняючы кіруючую ролю пралетарскай прамысловасьці і самога пралетарыяту (Прамова тав. Бухарына на XV Маск. губ. партканфэрэнцыі). Між тым, ня гледзячы на тое, што партыя яшчэ ў маі мінулага году агаласіла барацьбу за зьніжэньне цэн, у нас у працэсу першага пэрыяду кампаніі мела месца павышэньне розьнічных цэн. Асноўнымі напрамкамі барацьбы за зьніжэньне цэн павінны быць: 1) сьцісканьне „ножніц“ паміж цэнамі на сельска-гаспад. і прамысловыя тавары і тым самым узмацненьне рабоча-сялянскага блёку. 2) сьцісканьне „ножніц“ паміж цэнамі на зернавыя і на тэхнічныя культуры, каб узмацніць сыравінную базу прамысловасьці.

10. Адзначыўшы яўна невыстарчальнае выкананьне мінулых гадоў дырэктыў ЦК і Савету Працы і Абароны аб зьніжэньні на 10 проц. розьнічных цэн, на невыстарчаючыя тавары проці ўзроўня 1 мая, лютаўскі пленум ЦК ухваліў: «чаго-б гэта ні каштавала, улічваючы зьніжэньне адп

Шырокім фронтам супроць бюракратызму.

Як змагацца з валакітай і бюракратызмам у страхавых касах.

(У парадку прапановы).

Дзеля таго, каб пасьпешна змагацца з валакітай і бюракратызмам у страхавых касах, у першую чаргу неабходны ўважлівыя адносіны з боку страхавых работнікаў да застрахованых, памятаючы, што яны маюць справу з людзьмі, якія перавесьлі хваробу, з беспрацоўнымі і інвалідамі.

Другое—кіруючы склад страхавых органаў павінен штодня думаць, як палепшыць сыстэму абслугоўваньня застрахованых, улічваючы самыя малыя непаразуменьні паміж работнікамі страхавых кас з застрахованымі за дзень.

Трэцяе—даць застрахованаму поўны, ясны адказ на ўсе яго пытаньні, дзеля чаго работнікі, якія маюць адносіны да застрахованых, павінны быць падрыхтаванымі і аўтарытэтнымі ў вачох застрахованых.

Чацьвёртае—вывешваць на відных месцах справачнікі ў выглядзе плякатаў і лёзунгаў, з паказаньнем, да каго з якімі пытаньнямі зьвяртацца і ў які час, якія патрэбны дакументы для атрыманьня кожнай грашовай дапамогі.

Пятае—старацца як найменш ганяць застрахованага ад аднаго стала да другога, кожнае пытаньне застрахованага павінна быць закончана ля аднаго стала.

Шостае—як найменш вымагаць дадатковых справак і пасьведчаньняў ад саного застрахованага. Калі гэткія неабходны дзеля забясьпечаньня правільнасьці выдачы дапамогі, запытацца, у каго належыць, праз тэлефон ці затрэбаваць пісьмовае пацьвярджэньне праз страхкасу.

Сёмае—усімі спосабамі змагацца з чаргамі, арганізаваўшы дадатковыя пункты дзеля выплаты дапамогі ў прамысловых раёнах, калектыўныя выплаты на самых прадпрыёмствах і г. д.

Восьмае—страхкасы павінны абвяшчаць аб усіх новаўвядзеньнях у галіне сацыяльнага страхаваньня шляхам дакладаў на агульных сходах, вечарох пытаньняў і адказаў, артыкулаў у друку і праз камісіі аховы працы.

Дзевятае—мець пастаянную жывую сувязь з застрахованымі праз пізавыя праф'ячэйкі, а асабліва зьвязаць сваю работу з камісіямі аховы працы на прадпрыёмствах.

З боку самых застрахованых у гэтых адносінах патрабуецца:

першае—памятаць, што сродкі страхкасы—зьберажэньні на чорны дзень, да якіх трэба адносіцца ашчадна.

Другое—ідучы па дапамогу, памятаць, што ён ідзе ў страхкасу атрымаць грошы, дзеля чаго неабходна мець спраўны дакумант.

Трэцяе—дапамагаць страхкасе ў яе рабоце ўказаньнямі, як ашчадзіць страхавую капейку, і як палепшыць работу страхкасы.

Чацьвёртае—дапамагаць страхкасе ў змаганьні з сымулянтамі і з асобамі, якія імкнуцца атрымаць ці атрымліваць дапамогі або пэнсіі з страхкасы, ня маючы на гэта права.

Пятае—патрабаваць дакладаў і справаздач страхкас на агульных сходах свайго прадпрыёмства.

Вось асноўныя ўмовы, якія павінны выконвацца камітэтам страхкасы і самымі застрахованымі.

Р. Алесін.

„Цемна вада...“

Задушала Барысаўская акр. страхкаса перавесьці сваіх утрыманцаў на сьвежае паветра і, абрала для гэтага месца ў м. Бобры. Прыехала ў Бобр камісія з пяці асоб і ўсе знатныя: доктар, старшыня страхкасы, кіраўнік спраў, акр. праф. бюро, старшыня кантрольна-ўрач. камісіі і яшчэ адзін. Зьявіліся ў сямігодку, абгледзелі адзін будынак, даведаліся аб кубатуры пакояў і вярнуліся назад у Барысаў.

Праз дні два зьяўляюцца ў м. Бобр загадчык акрАНА і старшыня акр. страхкасы для канчатковага вырашэньня пытаньня аб пераводзе Барысаўскага дому адпачынку ў м. Бобр у адно з памяшканьняў сямігодкі. Адтуль паехалі ў м. Крупкі, у райвыканком выклікалі туды загадчыка 7-кі, напісалі ўмову аб перадачы памяшканьня, умову зацьвердзіў РВК, і пасьля прапанавалі загадчыку 7-годкі к 10 красавіка аслабаніць будынак, бо павінен быў пачацца рамонт. Тут і пачынаецца самае цікавае.

Загадчык сямігодкі, зьвярнуўшыся з м. Крупкі, загадвае настаўнікам, якія карысталіся кватэрамі ў школьным будынку, тэрмінова выбрацца з кватэр, бо зараз павінны зьявіцца рабочыя для рамонту.

Праз два дні зьяўляюцца рабочыя, заняткі ў старэйшым канцэнтры скарацілі і мэблю перанесьлі ў другія памяшканьні. Вядома, што частку яе зламалі. Але памяшканьне аслабанілі. Пачалася праца па рамонту. Закупілі матар'ял, усё як сьлед.

А тут праз два дні зноў нечакана зьяўляецца прадстаўнік страхкасы і кажа: спыніць працу, бо Менск не згаджаецца з пераводам дому адпачынку ў м. Бобр. Спынілі.

Вынікі: дарма патрацілі грошы на паездкі, дарма прывялі ў нягодпасьць частку сьцен у школе, дарма перашкаджалі заняткам сямігодкі, дарма паломана частка парт і ўрэшце дарма запланілі 60 руб. таму, хто браў падрад на рамонт.

Пытаньні: дзе была галава ў тых, хто сунуўся ў рэчку не спрасіў, дзе брод, і чаму патрэбна было пераводзіць м. Бобр дом адпачынку, калі ў г. Н.-Барысаве ёсьць уласны добры будынак.

Знаёмы.

Праводзім рацыяналізацыю апарату.

(Женскі акруговы фінаддзел).

У пачатку сакавіка г.г. НКФБ запрапанаваў акруговым фінаддзелам прыступіць да працы па падрыхтоўцы матар'ялаў к правядзеньню рацыяналізацыі апарату з разьлікам, каб да мая было магчыма абагульніць апрацаваны матар'ял і правесьці намечаныя мерапрыёмствы ў жыцьцё.

Пачатак работы зрабіла арганізацыйнае бюро яшчэ ў кастрычніку 1926 году пры пераводзе справаводзтва на картачную сыстэму, што дало значнае спрашчэньне і станоўчыя вынікі

Галоўным прынцыпам рацыяналізацыі зьяўляецца ўвядзеньне адказных выканаўцаў. У акруговых фінаддзелах паддаддзелаў больш ня будзе. Заместа п/аддзелаў будуць групы ці галіны, як, напрыклад, заместа падатковага п/аддзелу—падатковая галіна ці падатковая група, непадатковая галіна і г. д.

Ранейшы папера праходзіла 4, а то і 5 інстанцый: заг. аддзелам, заг. п/аддзелам, інспэктара ці інструктара і толькі тады пападала да выканаўцы; зараз яна непасрэдна пападае да выканаўцы. У кожнай групе ці галіне работы выканаўцы працуюць самастойна, зьвяртаючыся ў неабходных выпадках за растлумачэньнем ці кіраўніцтвам да нам. загадчыка акруговага фінаддзелу, якіх у аддзеле будзе два і кожны будзе кіраваць непасрэдна двумя—трыма галінамі работы, тады як у кожнай групе падпарадкаваньня ніякага ня будзе.

Увядзеньне такога спрошчаньня дасьць магчымасьць зрабіць апарат больш гібкім і дакладным, а таксама ўдзешавіць яго кошт; да гэтага-ж часу ён быў разбухлы; пры правядзеньні рацыяналізацыі, увядзеньні картачнай сыстэмы справаводзтва, а таксама з пераходам на картачную сыстэму ў акладным рахунководзтве, фінінспэкцыях і інш., работа значна спросьцілася, і для абслугоўваньня будзе патрэбен куды меншы штат супрацоўнікаў.

Другі станоўчы бок, гэта тое, што кожны супрацоўнік будзе адчуваць адказнасьць за даручаную яму работу, у сувязі з чым будзе больш інтэнсыўна працаваць, выяўляючы максымум ініцыятывы, тады як пры існаваньні п-аддзелаў, загадчыкаў, інструктароў і г. д., усё гэта адсутнічала і ініцыятыва была забіта, бо за ўсё адказваў загадчык, а непасрэдны выканаўца заставаўся ў баку і не адчуваў адказнасьці за работу, якую выконваў, не выяўляў сябе, бо ўсё выходзіла ад загадчыка.

Пытаньне рацыяналізацыі неаднакроць абгаварвалася ў эканамічнай камісіі, на сходах, нарадах і ў гэтым актыўны ўдзел прымала большасьць супрацоўнікаў.

Пасьля апрацоўкі матар'ялу выявілася, што штат можна зьменшыць на некалькі дзесяткаў чалавек, і гэта ніколькі не адаб'ецца на рабоце, а наадварот, ёсьць усе падставы да таго, каб чакаць палепшаньня работы, зрабіць апарат больш гібкім і дакладным, адначасова ўдзешавіўшы кошт яго і захаваўшы ўсе функцыі, якія выконваліся да гэтага часу.

Зараз неабходна весьці далейшую работу па скарачэньню і спрашчаньню справаздачнасьці, а таксама пераглядзець функцыі апарату, зьнішчыўшы паралелізм у рабоце розных устаноў, бо ў гэтым сэнсе можна пажадаць яшчэ шмат чаго і ў гэтай галіне неабходна правесьці вялікую работу.

Такім чынам асноўнае ў рацыяналізацыі апарату зроблена.

Але на гэтым спыняцца нельга, і ў далейшым неабходна весьці работу ў тым-жа напрамку, з штодзённай рабоце трэба будзе ўсім супрацоўнікам выяўляць адмоўныя моманты ў рабоце, ставіць усе такія пытаньні на абгаворваньне эканамічнай камісіі, пасьля чаго ажыцьцяўляць усе мерапрыёмствы ў шырокім маштабе. Толькі пры ўдзеле шырокіх мас супрацоўнікаў магчыма пасьпешна вырашыць і будзе вырашана гэта вялікая і складаная задача. Толькі тады мы даб'ёмся эканоміі ва ўтрыманьні апарату, скараціўшы лішні штат і даўшы поўную нагрузку супрацоўнікам для пасьпешнай і прадукцыйнай работы.

Б. С.

„СОРОК ПЕРВЫЙ“?

Таксама „рацыяналізацыя“.

Яшчэ з лістапада 1926 году большасьць акруговых аддзелаў Барысава разьмешчаны ў адным будынку, а побач з апошнім знаходзіцца і наш акркамгас.

Калі трэба тэй ці іншай установе зьвярнуцца ў другую—суседнюю, дык здаецца пры такім разьмеркаваньні лепшага ня прыдумаеш.

Гэта здаецца нам, а вось на справе...

Зараз забачыце.

Атрымоўваецца ў акрана паведамленьне судовага выканаўца ад 15 красавіка г. г. аб неабходнасьці ў трохдзённы тэрмін унесьці грошы па спаўніцельнаму лісту ў суме 46 руб.

Але паперка гэтая атрымоўваецца толькі 18 красавіка, між тым як адна канцылярыя ад другой усяго праз калідор.

Вось вам і задачка для малодшага ўзросту,—няхай дзеткі вылічаць, з якой куткасьцю рухалася паперка з аднаго пакою ў другі...

Яшчэ больш рацыяналізацыя, відаць, пастаўлена ў нашым акркамгасе.

Паведамленьне аб неабходнасьці ўнесьці арэндную плату за памяшканьне культасьветных устаноў гораду з папярожданьнем, што тэрмін узносу плацяжу бяз пені канчаецца 10 красавіка, атрымана ў акрана ўсяго толькі...

19-га красавіка...

Цэлых дзевяць дзён патрабавалася беднай паперцы прапаўсьці з аднаго ў другі сумежны будынак.

Бачыце, рацыяналізацыя канцылярый у нашых установах «рацыяналізавана», як гэта гаворыцца, далей ехаць некуды.

А то ў цэнтры ставяць пытаньне аб рацыяналізацыі,—ды тутака на мясцох гэта справа і бяз цэнтру вырашаецца проста, як цукерка.

В. Зайцаў.

Жыцьцё і праца асьветніка.

„Дзень Друку“ у школах.

Набліжаецца час правядзеньня «Дню Друку» (5 мая). Школа павінна прыняць самы актыўны ўдзел у правядзеньні гэтага дню. Праца павінна распачацца ўтварэньнем спэцыяльнай камісіі па правядзеньню «Дню Друку». У камісію павінны ўвайсьці: прадстаўнік педрады, вучкому, фарпосту, ЛКСМБ, рэдкалегіі і бібліятэкар.

Правядзеньне школай «Дню Друку» павінна даць вучням яснае ўяўленьне значэньня рабочага друку ў часы падпольнай працы рабочых арганізацый, у часы першай рэвалюцыі, імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны, у справе савецкага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Даклады на гэтыя тэмы неабходна паставіць на агульным сходзе вучняў (асабліва старэйшых груп) .Да «Дню Друку» неабходна правесьці выстаўку насьценных газэт, якія выдаваліся і выдаюцца ў школе, паставіць даклад аб значэньні насьценнай газэты ў справе арганізацыі вучнёўскай масы і кружка вучкораў, аб дасягненьнях і недахопах у насьценнай газэце. Адначасна павінна праводзіцца кампанія за выпіску газэт вучнямі (старэйшых груп) і іх бацькамі. Вельмі пажадана, каб школа змагла праводзіць гэтую працу з удзелам бацькоў вучняў і вясковай моладзі.

Да «Дню Друку» неабходна выпусьціць спэцыяльную насьценную газэту, дзе павінны быць высьветлены асноўныя заданьні насьценнай газэты з перадавіцай: «Што дала і дае насьценная газэта», далей неабходна зьмясьціць артыкулы: аб гісторыі сваёй насьценнай газэты, якія палепшаньні ўнесла насьценная газэта ў школьнае жыцьцё, праца вучкораў, чытаньне і выпіска газэт вучнямі школы.

Дзеля падняцьця зацікаўленасьці кнігай і папулярызацыі кнігі сярод вучняў і дарослага насельніцтва неабходна зрабіць выстаўку кніг пры бібліятэцы, скласьці дыяграму аб пашырэньні чытачоў кнігі, паставіць спэцыяльны даклад па тэму аб значэньні кнігі, як крыніцы ведаў, неабходных для гаспадарчага і культурнага будаўніцтва.

У школах (дзе маюцца сілы) неабходна правядзеньне вечароў друку з кароткімі дакладамі, дэклямацыяй, спэктаклем, ці канцэртам.

Правядзеньне «Дню Друку» павінна мець на ўвазе практычныя вынікі: палепшаньне выданьня насьценнай газэты і школьных часопісаў; ацягненьне большага ліку вучняў у гурток вучкораў, ці арганізацыя гэтага (калі няма); прапаганда за павялічэньне чытачоў і дапісчыкаў у газэты і дзіцячыя часопісі; пашырэньне падпісчыкаў сярод насельніцтва; знаёмства з кнігай і пашырэньне яе сярод працоўных мас.

Там, дзе «Дзень Друку» будзе праводзіцца хатай-чытальняй, ці нардомам, школа можа гэты дзень правесьці сумесна з хатай-чытальняй, але неабходна правесьці і спэцыяльную працу сярод вучняў, выходзячы з асабліва-васьцяй дзіцячага ўзросту і інтарэсаў дзяцей.

В. Самцэвіч.

Барысаў.

Больш увагі пераводу вучняў з малодшага ў старэйшы канцэнтр.

(У парадку абгаварэньня).

Што наша сямігодка выпушчае вучняў слаба падрыхтванымі, гэта ведае кожны І супроць нельга нічога сказаць. Асабліва ж гэта добра вядома настаўніку. Але нельга вінаваціць у гэтым толькі яго (недарэчнасьці яшчэ есьць). Я б сказаў, што настаўнік, пры мізэрнай аплаце наогул, працуе сумленна, шчыра. Праца ў гурткох, распрацоўка і грунтоўнае вывучэньне кожнаю школаю асобных пэдагагічных пытаньняў на пэдсаветах, у камісіях аб гэтым сьведчыць. Настаўнікаў цэнтральнае дасьледчае школы нельга западозрыць, што яны дрэнна працуюць і мала кваліфікаваны, а посьпехі вучняў мала чым розьняцца ад масавае школы.

Прычын многа і прычын аб'ектыўных. Галоўныя: недахоп падручнікаў у вучняў і навучальных дапамог у школе; перагрузка зьменаў памяшканьня і яго цесната; перагрузка камплектаў і разнастойнасьць узросту ў групе (11 гад. разам з 16 г.); дрэннае наведваньне (па хатніх прычынах) вучняні школы, перагрузка (асабліва ў 2-м канцэнтры) і нестабілізаванасьць праграм; іншы раз дрэнны падбор настаўнікаў. Думаю, што з цягам часу, адзначаныя прычыны будуць зьнішчаны: аб іх многа гаворыць, яны стануць на чарзе. Але, на мой пагляд, у гэтым жа вуч. годзе неабходна зрабіць наступнае, што значна направіць спра ву нашае школы: 1) зрабіць самы строгі адбор вучняў у 2-і канцэнтр (з 4-е кл. у 5-ю) і 2) даць больш ініцыятывы шк. саветам пры выбары настаўніка.

Звычайна настаўнікі 2-га канцэнтру крыўдуюць, што ім даюць вучняў слаба падрыхтаванымі. Часьцяком гэта праўда. А яшчэ больш праўды ў тым, што наогул справа ў школе кульгае.

Але адбор патрэбен і больш строгі. 4-я кляса для многіх вучняў з'яўляецца астатняй клясай—папершае; а падругое—патрэбен кантроль (кантроль аснова пасьпяховасьці ўсялякае справы). Праўда, кантроль павінен быць у самым настаўніку, у яго сьвядомасьці, зацікаўленасьці; у курсе справы павінен быць інспэктар акрана і асабліва загадчык школы. Але загадчык школы страшэнна перагружаны працаю. Трэба прызнацца, што бываюць выпадкі, калі **для зьніжэньня проц. другагоднікаў пераводзяцца і слабыя вучні.** Вось, па маей думцы, у адбор вучняў для 5 кл. патрэбна ўцягнуць настаўнікаў 2-га канцэнтру. Гэта зьмен шыць нараканьні на 1-ы канцэнтр, ускладзе больш адпаведнасьці наогул на настаўніка, падцягне цалкам усю школу.

Я тут ня вызначаю спосабу адбару. Ці ён будзе ў выглядзе характарыстыкі пасьпяховасьці вучня на аснове яго працы за год (спыткі), ці гутаркі з вучням у канцы году (падагуліваньне)—гэта справа самых настаўнікаў і мэт. камітэту пры НКА. Аднак толькі для мяне ясна: павінны быць уцягнуты настаўнікі 2 канцэнтру і прадстаўнікі зацікаўленыя установы і арганізацый.

Звычайна настаўнікі прызначаюцца акр'ана, шк. савет саўсім у баку. Трэба даць шк. савету большую ініцыятыву пры выбары настаўніка, а разам з тым і ўзлажыць на яго большую адказнасьць—справа ў школе палепшыцца.

Спадзяюся, што закрапутыя мною балючыя пытаньні будуць усебакова абгавораны настаўніцтвам.

Ка—сь.

Праца сярод неарганізаваных дзяцей, не ахопленых школай.

Як відаць з матар'ялаў аб становішчы народнай асьветы ў БССР, школамі абхоплена каля 60 проц. дзяцей школьнага ўзросту. Такім чынам, шмат дзяцей застаецца па за сьценамі школы. Становішча іх у культурных адносінах надта дрэннае. У той час, калі дзеці, якія вучацца ў школах, маюць магчымасьць праводзіць арганізацыйную і культурную працу ў сваіх шэрагах, неарганізаваныя дзеці гэтай магчымасьці ня маюць. Вучні-жа галоўным чынам уваходзяць і ў склад піанэрскіх арганізацый, што яшчэ больш арганізуючы ўплыў робіць на іх. Дзеці, ня маючы магчымасьці наведваць школу, праводзяць свой час кожны па свойму. Адгэтуль на вёсках, у гарадох і мястэчках шмат усялякіх недарэчнасьцяў: кражы, хуліганства, а летам, асабліва на вёсцы, і пажары. Узімку ўсе яны за адсутнасьцю належнай вопраткі і абутку сядзяць кожны па сваіх кутках і толькі вясной і ўлетку ўся гэта дзетвара ажывае—і тады трымайцеся гароды, сады. І вот школа праз свае вучнёўскія арганізацыі і павінна зьвярнуць на такіх дзяцей сваю ўвагу, накіраваць іх энэргію ў другі бок. Да гэтага часу, калі тая ці іншая школа і запрашала на свае сьвяты навучыў, дык усё гэта было выпадкова, не насіла сыстэматычнасьці і ў час сьвята на запрошаных зварачвалася мала ўвагі. А на вёсцы школа зьяўляецца адзінай культурнай установай. Пагэтаму з пачатку кожнага навучальнага году праца сярод неарганізаваных дзяцей павінна ўваходзіць у вытворчы яе плян. Працу такую магчыма правесьці ўва ўсякай школе, дзе ёсьць добры настаўнік і добра з'арганізаваны вучні. Запрашаючы на кожнае сьвята ўсіх дзяцей вёскі з іх бацькамі, зьбіраючы іх праз вучняў у асобныя вызначаныя з гэтай мэтай вечары, паступова магчыма пакласьці пачатак іх арганізаванасьці. Вядома, што ў гэтай справе важную ролю павінны іграць піанэры там, дзе яны ёсьць. Спачатку няхай вучні паставяць хоць маленькую дэклямацыю, калі ёсьць, кароткую п'еску. З працягам часу магчыма будзе павесьці і чытаньне маленькіх артыкулаў, для чаго можна выдаліць найбольш здольных для такой справы вучняў.

Пісаць рацэпт усей працы немагчыма, бо кожная школа працуе ў асобных умовах. Кожны настаўнік пры жаданьні можа зрабіць тое, што сказана. І працу такую павесьці неабходна, у гэтым адна з задач школы ў барацьбе за культуру, за сацыялізм.

Настаўнік.

М. Бобр, Барысаўскай акр.

Як зямлю адабралі ў настаўніка, ды папу далі.

Што-ж гэта рабіць?! Дзе-ж нашы зямельныя законы падзеліся? Каму яны пасабляюць? Я, савецкі настаўнік з 1919 году, атрымаў сабе кавалачак з паўдзесяціны быўшага папоўскага гароду. Карыстаўся ім, карыстаўся і не заўважыў, як ён стаў зьмяншацца. У 1926 годзе сельсавет адабраў 1/4 дзесяціны і даў яе беднаце, а мне заміняў яе лепшай.—Даў мне адну чвэрць дз. побач з царкоўным садам. Праўда, гэта зямелька лепшая, ну, няхай будзе і так. Маўчу я. Усё па закону няхай будзе.

А вось сёлета дык саўсім ужо ня ведаю, што гэта такое?

Узноў сельсавет і гэту адну чвэрць гароду адабраў, дый каму даў? Папу! Адабраў у настаўніка і папу даў.

Было гэта так—у нас у Мокрым ёсьць поп. Яго завуць П. М. Вагулька. Яго зрабілі папом нашы багацейшыя грамадзяне. Даўней ён быў псаломшчыкам, уладаў часткай царкоўнага гароду, а як стаў папом, дык ён захацеў скарыстаць і той гарод, якім даўней поп карыстаўся. Суд яму прысудзіў гарод толькі той, якім ён карыстаўся да 1926 году, а як стаў сельсавет Макранскі прыводзіць у спаўненьне гэту пастанову суда, дык ён ужо ня лічыўся з тым, ці карыстаўся гэты поп той зямлёю, якую цяпер адвёў. Дык вось цяперака у настаўніка зямлю адабралі ды папу аддалі.

А чаму? Таму, што гэты настаўнік зімой на зямлі не працуе, а толькі адну матку старую тут трымае. Вось зямельку ў яе і забралі. Цяпер і папрашу радакцыю растлумачыць, ці па закону гэта, ці не?

С. І. Бародзіч.

Ад рэданцыі: Гэты «перадзел» здарыўся ў Быхаўскім раёне, Магілеўскай акрузе. Чакаем тлумачэньня па выместу заметкі ад Быхаўскага райвыканкому.

НЕПРАЎДАПАДОБНАЕ.

(Койданаўскі раён).

У Койданаўскім раёне Паўлаўшчынская школа.

А ў Паўлашчынскай школе—настаўніца.

— Працавітая, энэргічная, актыўная, з камсамольскім энтузіязмам, з творчай ініцыятывай.

Настаўніца захоплена працай.

Насельніцтва захоплена настаўніцай — «Золата!.. «Душа!..»

І ў выніку сьцены школы,—жывыя малюнкі яе жыцьця,—усьміхаюцца вабна комплексамі, плянамі, вучотамі, калекцыямі, правіламі, пастановамі, плякатамі, малюнкамі.

А кансэрватыўная, фанабэрыстая, шляхэцкая вёска—ускалыхнулася зажыла пановаму—

Гурткі розныя, чытка газэт, спэктаклі, гутаркі, лікбез...

І нават, што падобна на казку...

У фанатычнай, польскай, прыгрэбнічнай вёсцы антырэлігійная прапаганда і з посьпехам.

Каляды і Новы Год Паўлаўшчына сьвяткавала не ў касьцёле, а ў школе на спэктаклі.

———

Інспэктура (польская) працу Паўлаўшчынскай настаўніцы падагуліла. Ведама—гэта яе абавязак.

У пакінутай анкеце значыцца:

«Праца вельмі добрая»

«Адносіны сялянства да настаўніцы —вельмі добрыя і г. д. і г. д. і г. д

Адным словам усё «вельмі добра».

Гэта значыць на 5+.

Інспэктура падагуліла—і паехала.

А настаўніца, у сваёй «вельмі добра» паўзаленай школе асталася.

І хоць настаўніца была на пяць, усё-ж такі была звычайным чалавекам і, як кожны, патрабавала мець памяшканьне. І мела памяшканьне гэта—ложак, аддзелены ад школы дошкамі ў рост чалавека, а ад гаспадароў хаты—куском паркалю.

А ў гэтым «памяшканьні» як на дварэ, так і у сярэдзіне.

Адлега—адлега, вецер—вецер, мароз—мароз.

(Гаспадарская сям'я жыла на вагромістай печы).

І здарылася тое, што няўхільна мусіла здарыцца. Настаўніца захварэла. Настаўніца памёрла. Настаўніцу пахавалі. Хворай суседзі настаўнікі прыносілі малако ў бутальках.

У «памяшканьні» настаўніцы бутэлька з малаком цераз гадзіну лопала, сьцьвярджаючы закон, што вадкасьці пры замярзаньні пашыраюцца.

. . . . . .

Хто павінен у сьмерці настаўніцы Зімохра?

А. Ф.

Трэба уводзіць новае ў школах.

Нашы сельскія школы за пэрыяд рэвалюцыі зрабілі шмат крокаў уперад у напрамку пашырэньня агульна-трудавога і палітычнага кругазору вучняў.

У гэтых адносінах справа многа залежыць ад настаўнікаў. Адны настаўнікі шукаюць нешта новае і нарэшце глыбока ўдаюцца ў палітыку, зьвяртаючы мала ўвагі на агульную асьвету, другія-ж настаўнікі як раз наадварот, праводзяць заняткі толькі ў агульна-асьветным напрамку. Затое вучні ў розных школах выходзяць з рознымі ведамі.

Па нашым раёне ў адной школе дзеці добра ведаюць канстытуцыю СССР, у суседняй болей таго, а ў трэцяй палітычнага вы нічога ня знойдзеце, вучань тут добра ведае арытмэтыку ды беларускую і расейскую мовы.

Прыблізна такі с мы малюнак вы знойдзеце ва ўсіх школах БССР і наогул ва ўсім СССР.

Трэба, каб агульна-асьветная галіна выкладаньня ішла поруч з палітычнай ва ўсіх школах. Нашым культаддзелам трэба зьвярнуць на гэта ўвагу.

Галоўнае, што трэба ўвесьці ў школах новае, гэта ўрок чыткі газэт і даваць заданьне чытаць іх на дом. Гэтага нідзе няма, але гэта неабходна.

Часта вечарамі бацькі, браты і сёстры саджаюць вучня ў свой круг і слухаюць яго чыткі. Вось тут якраз і магчыма было-б скарыстаць газэту.

Газэта вядома павінна быць лёгкая, мясцовая. Самай лепшай на мойму была-б мясцовая акруговая газэта. Для кожнай школы культаддзел павінен іх выпісваць некалькі экземпляраў, а галоўнае школа павінна дабіцца, каб выпісвалі бацькі вучняў старэйшых груп.

У гэтым маюцца лажаданьні самога насельніцтва. Часта ад таго ні іншага дзядзькі, дзіця якога вучыцца ў школе, можна начуць такія скаргі:

— Мой сын прыйшоўшы са школы толькі ведае чытаць пра салаўёў ды пра сьвіней, а болей нічога. А дай яму газэту прачытаць, то ён і ня зможа.

Калі прыслухацца да гэтага голасу сялян—стане неабходна даваць урок чыткі газэт у школе.

І трэба яго ўвесьці.

Селькор Гарбацэвіч.

Мазгі ў сьпірце...

Цэлая філёзофская сыстэма, цэлая ідэалёгія вымясьцілася ў гэтым невялічкім сказе **«дзе пьюць—там і льюць»**... Разгульна-нясьпісьменная, азіяцка-гультайская ідэалёгія... Дзе пьюць.. Гэта пастулата. **Піць**—гэта па-за дыскусыяй, бясспрэчна. Але гэтага мала,—трэба яшчэ пры гэтым абавязкова **ліць**. І ня проста **ліць. Палову трэба праліць.** І прытым—на ў куток, ня ў плювалку, а—там, **дзе пьюць...** Над сябе... Гэта ідэалёгія—наша горкая спадчына; боская, «царска-славянафільская» спадчына. З ёй вось прыходзіцца і весьці сталую і паўсюдную барацьбу. Усюды: на кухні, у быту, у сям'і—і ў трэсьце, у каапаратыве, у дзяржаўных органах. Мы ўкараняем эканомію ў быт. Піце нарэшце—але не пралівайце. Паважайце потную капейку. Але ў нагах у нас блытаецца вось гэта хамская, казацкая пагаворка **«дзе пьюць—там і льюць»**...

* * *

Белдзяржсьпірт. Хто не знаёмы з Белдзяржсьпіртам? Тым самым, які... ну, адным словам, які сьпіртам гандлюе? Няма ў нас такіх несьвядомых людзей.. Пытаньне, ці трэба Белдзяржсьпірту выдаткаваць 1500 руб. у год на рэкламу? Бо адмоўся Белдзяржсьпірт ня толькі ад газэтных абвестак, адмоўся ён ад шыльдаў—яго ўсё роўна знойдуць. Але Белдзяржсьпірту прыемна вядомасьць... Белдзяржсьпірт рэклямуецца. Рэклямуе пават № свайго тэлефону. Выкінуўшы на гэта сотні руб. Белдзяржсьпірт ня можа ня мець права гандляваць, калі ўсю сваю прадукцыю ён абавязан здаваць Цэнтрасьпірту?

* * *

Маючы тонкі густ сапраўднага арыстакрата, Белдзяржсьпірт любіць «вояжы», гэта падарожніцтва. Новыя, ведаеце, уражаньні, новыя людзі, знаёмствы, карысьць для асабістага кругагляду—наогул праветрываецца не перашкаджае. І вось ідзе ўсеагульнае, яўнае і патайнае «праветрываньне» дзяржаўных грошай на камандыроўкі. Можна, вразумела, ехаць і «ехаць». Людзі мала патрабуючыя, не закранутыя вялічэзным ростам культуры, людзі без асаблівых попытаў—могуць напрыклад, ехаць у трэцім клясе. Але інспэктары Белдзяржсьпірту—людзі ня звычайныя, а культурныя. На Украіну за кукуразай яны езьдзяць **толькі ў мягкіх вагонах.** Камандыроўкі Белдзяржсьпірта—былі выпадкі—цягнуліся па 3 месяцы. Ранейшы дырэктар Апачынскі адных сутачных паезьдзіў каля 900 руб. Звозчыкі. Яны да Белдзяржсьпірта таксама, дзякуй богу, не прыкладваліся. Па некаторых камандыроўках звозчыкі абыходзіліся ў 40 руб. Ехаць—так ехаць.

За апошні апэрацыйны год камандыроўкі каштавалі трэсту 11.403 руб. Гэта значыць, што выдаткі на камандыроўкі складалі 20,8 проц. ад агульнай сумы заработку; і гэта ў той час, як, згодна норм цэнтру, гэты процант не павінен перавышаць 5,8 да зарабо.

Але Белдзяржсьпірту, вачавідна, закон ня пісаны...

* * *

Як і трэба было чакаць—у Белдзяржсьпірце супрацоўнікаў звычайных няма. Куды там. Усе незаменныя... А незаменнага працаўніка, вы-ж ведаеце-ці знойдзеш у Менску? У гэтай глухой правінцыі? Не, вразумела. Сапраўды—незаменнага працаўніка трэба выпісаць. І вось выпісалі. З Кіеву. З Пяцігорску. Ну, а супрацоўнікам выпісаным належаць так называемыя над'ёмныя. На іх ня скупіліся. Нейкі Якубоўкі, выпісаны з Пяцігорску на пасаду кіраўніка спраў атрымаў праяздных 512 руб. І ня дзіва: ці ёсьць у Менску добрыя кіраўнікі спраў. Гэта-ж правінцыя. Сапраўдныя, істотныя кіраўнікі спраў нараджаюцца, як і персікі, толькі пад гарачым небам Каўказу, у падножжа сьнегавога Эльбруса. А тут... Тут нараджаюцца **замянімыя** кіраўнікі спраў.

Некаторыя малодчыкі атрымалі па 200, па 150, па 100 руб... Ня проста атрымалі, а над'ёмныя атрымалі...

Каб скончыць аб «незаменных»—некалькі слоў аб кіраўніку спраў Якубоўскім. З ім адбылося ня так даўно кенскае здарэньне. Ён, бачыце, ехаў (у мяккім вагоне) на Украіну за кукурузай. Ніхто не гарантаваны ў дарозе ад няшчасных здарэньняў. У сумненнага, распранезаменнага Якубоўскага ўкралі 1089 р. Ня тысячу і не 1100 р. а роўна, як агурэц 1089 р. За гэтую самую пакражу Якубоўскі і сеў у вастрог. Не паверылі яму людзі і западозрылі, чорт ведае ў чым—у раст-

* * *

Працаўнікам трэба плаціць. Гэта ісьціна дэтальна распрацавана яшчэ ў Ветхім Завеце. Праўда—там ня мелася на ўвазе, уласна, Белдзяржсьпірт, але гэта справы не мяняе. Трэба плаціць—і зразумела. Выключная верпасьць гэтага закону асабліва яскрава выяўляецца ў адносінах працаўнікоў незаменных. Ім трэба ня проста плаціць, ім трэба **шмат** плаціць.

75 проц. яго супрацоўнікаў атрымлівалі нагрузку і спэцстаўкі. Шырока практыкавалася выдача звыштэрміновых. За красавік—чэрвень мінулага году заработак складаў 14.032 р. За кастрычнік—сьнежань гэта лічба дайшла да 17.202 руб. Павялічэньне на 22,5 проц.

За апошні год штат павялічыўся прыблізна на 12 проц., галоўным чынам, па бухгальтэрыі, па той самай бухгальтэрыі, якая **адстае на 5 месяцаў.**

* * *

Белдзяржсьпірту вельмі падабалася працэдура будаўніцтва. Галоўным чынам таму, што гэта зараз самае моднае заняцьце. Вынікі гэтага захопу? Уласна гаворачы... Як вам сказаць... Не, няхай лепей сам Белдзяржсьпірт скажа... Скажы, Белдзяржсьпірт, не саромся... мы слухаем:

— Аднаўленьне заводаў рабілася без эканамічнага і тэхнічнага абсьледваньня, бяз вучота сапраўдных патрэб, бяз розных каштарысаў і разьлікаў, без тэхнічнага кантролю і нагляду...

Гэта па крайняй меры шчыра... Маладзец, Белдзяржсьпірт... Дай галоўку, гандлёвая дзейнасьць Белдзяржсьпірту. Звычайным маленькім чалавечым мазгам тут і рабіць няма чаго... Раскройце раты, вылупце вочы і, галоўнае, старайцеся ня траціць прытомнасьці. Толькі вытрыманыя, настоеныя 90° сьпірта здольны правіць такія геніяльныя камэрцыйныя выгіны...

Не зважаючы на забарону Наркамгандлю—Белдзяржсьпірт гандлюе. Яму забараняюць, гаворыць, што яму шкодна гандляваць—а ён нічога сабе—ганяць сабе сьпірт, а ён утрымоўвае яшчэ склад і 8 крам. Ня пісаны яму законы... Ну, а калі трымаеш магазыны, то трэба мець тавар. І вось Белдзяржсьпірт закупае ў «народных маёнтках» Грузіі 60 саракавядзёрных бочак віна. Плаціць за гэта 27.700 р. За карыстаньне бочкамі было апрача таго ўплочана 489 руб. У забясьпечаньне тэрміновага звароту (тэрмін 4 месяцы) бочак былі выданы Грузіі гарантыйныя вэксалі на 80 руб. за бочку. Да тэрміну было зьвернута толькі 11 бочак, з прычыны нязвароту рэшты бочак да вышэйазначанага тэрміну Белдзяржсьпірт быў прымушаны адасласць за іх 3889 р.

За цэлы год Белдзяржсьпірт не прадаў яшчэ і паловы ўсяго купленага віна...

На шчырасьць Белдзяржсьпірту мы ўжо ня раз зазначалі. Ня можам устаяць перад спакусай—яшчэ раз гэтую шчырасьць працытаваць:

— Мы ня можам ня бачыць—гаворыць д

Аб арганізацыйных формах мясцовай прамысловасьці.

(*У парадку абгаварэньня*).

Разьвіцьцё мясцовай прамысловасьці высунула адным з галоўных пытаньняў—пытаньне арганізацыйнае.

Па гэтаму пытаньню думкі тых органаў, на якіх ляжыць забота аб мясцовай прамысловасьці, разыходзяцца. Высоўваюцца тры варыянты: першы—самастойны аддзел пры ВСНГ у цэнтры і пры акрвыканкомах у округах; другі—пэдаддзел мясцовай прамысловасьці пры акркамхозе і, такім чынам, па вярцікальнай лініі ён падлягае апроч акркамхоза — галоўкамхозу і ВСНГ і, наканец трэці варыянт—аддзел мясцовай гаспадаркі, які павінен абслугоўваць камунальныя і чыста прамысловыя прадпрыёмствы. Падлягае ён на вярцікальнай лініі таксама двум установам—галоўкамхозу і ВСНГ.

Наша думка, што найбольш мэтазгоднай арганізацыйнай формай зьяўляецца першы варыянт.

Перавага яго складаецца ў тым, што тут мы маем яскравую структуру в вызначэньнем органаў, якія адказваюць за стан і разьвіцьцё мясцовай прамысловасьці. Усякае раздваеньне кіраўніцтва прывядзе к таму, што як прыказка кажа «у сямі нянек—дзіця бяз носа».

Разьвіцьцё і ўмацаваньне ўсёй дзяржаўнай прамысловасьці мы маем толькі дзякуючы таму, што мы адмовіліся ад «многаначалия» і ўстанавілі яскравую сыстэму органаў, адказных за стан прамысловасьці.

Падляганьне аддзелаў мясцовай прамысловасьці і камунтрэстаў—акркамхозу фактычна ўтварае лішнюю бюракратычную надбудову.

Абсьледваньне, зробленае РСІ, цалкам гэта падкрэсьліла. Прадстаўніцтва камтрэстаў у акрвыканкомах і іншых органах праз акркамхоз фактычна абмяжоўвае гаспадарчы размах і адказнасьць гэтых трэстаў (альбо асобных прадпрыёмстваў).

Да таго-ж камхозы фактычна ня могуць нічым дапамагчы камтрэстам, затым, што галоўнае, чаго трэсты патрабуюць,—тэхнічныя сілы і зваротныя сродкі, а гэтага камхозы даць ня могуць. Арганізацыя аддзелаў мяс. гаспадаркі, якія павінны аб'яднаць прамысловыя і камунальныя прадпрыёмстаа, шляховае будаўніцтва і г. д., сябе не апраўдвае. Трэба раз назаўсёды адмовіцца ад энцыклёпэдызму ў гаспадарчай справе. Нельга патрабаваць, каб кіраўнік аддзелу мог ахапіць усе гэтыя галіны. Уцягненьне ў гэты аддзел спэцыялістаў па неабходных галінах—не мэтазгодна, бо яно ня толькі падаражае кіраўніцтва, але пры колькасным недахопе гэтых спэцыялістаў, апошніх адрываюцца ад нізавых зьвеньняў, дзе яны бязумоўна больш патрэбны і могуць быць мэтазгодна скарыстаны.

Пры адсутнасьці-ж гэтых спэцыялістаў, а значыць і жывой працы, гэтыя аддзелы робяцца бюратратычнымі папяровымі канцэлярыямі, якія ніякага ўплыву на мясцовую прамысловасьць мець ня будуць і адыграюць шкадлівую ролю ў далейшым разьвіцьці прамысловасьці.

Зусім натуральна, што толькі ўтварэньне самастойных кіруючых органаў мясцовай прамысловасьці ў округах найбольш мэтазгодная форма. Аб'яднаньне гэтых органаў у рэспубліканскім масштабе павінна рабіцца праз аддзел мясцовай прамысловасьці пры ВСНГ, які, апроч кіраўніцтва акруговымі аддзеламі, павінен будзе зьвязваць плянаваньне і рэгуляваньне мясцовай прамысловасьці з агульнадзяржаўнай—рэспубліканскай і саюзнай прамысловасьцю.

Зразумела, што гэтыя аддзелы не павінны стаць бюракратычнымі балячкамі на маладым целе мясцовай прамысловасьці.

Камтрэстам і асобным прадпрыёмствам павінна быць забясьпечана запраўднае самастойнае кіраўніцтва ў межах вызначаных, зацьверджаных, адпаведнымі органамі, плянамі. Роля аддзелаў (колькасны склад працаўнікоў аддзелаў—пытаньне практычнае) павінна толькі абмежавацца рэгуляваньнем і плянаваньнем прамысловасьці.

М. Баран. А. Жук.

Карэспандэнт аб сваёй працы.

Дзень Друку---сьвята працоўных.

Рабкоры і селькоры, рыхтуйцеся да Дню Друку.

5 мая—Дзень Друку, дзень масавага сьвята рабселькораўскай арганізацыі і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

У працягу «двухтыднёвіка друку», які будзе праводзіцца з 5 па 20 мая, рабселькораўскай арганізацыі трэба скарыстаць усе магчымасьці для таго, каб прыцягнуць да ўдзелу ў сьвяткаваньні як мага больш рабочых і сялян, пазнаёміць іх з гісторыяй пралетарскага друку, з яго мэтамі і задачамі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Што патрэбна зрабіць

на прадпрыёмствах?.

Рэдкалегіі насьценгазэт павінны да Дню Друку выпусьціць чарговыя нумары насьценгазэт.

Па агульным сходзе рабочых і служачых прадпрыёмства зрабіць справаздачу аб працы рэдкалегіі і рабкораўскага гуртка. Высьветліць перад рабочымі тыя дасягненьні па заметках рабкораў, якія маюцца на прадпрыёмстве.

Рэдкалегіі насьценгазэт і рабкораўскія гурткі павінны арганізаваць суд над газэтай, дзе магчыма выстаўку насьценгазэт, вечар друку і г. д.

Пажадана ў час «двухтыднёвіка друку» правесьці перавыбары рэдкалегій насьценгазэт і перайменаваць насьценгазэты ў органы рабочых і служачых даннага прадпрыёмства.

У вёсцы

рэдкалегіі павінны прыстасаваць да Дню Друку выпуск насьценных газэт.

Сумесна з партыйнымі ці камсамольскімі ячэйкамі правесьці агульныя сходы сялян з дакладамі аб Дню Друку.

Селькораўскія гурткі павінны падагуліць вынікі сваёй гадавой працы і намеціць напрамак далейшага разгортваньня яе.

Вельмі карысна арганізаваць раённыя выстаўкі насьценгазэт; правесьці суд над газэтай; арганізаваць вечары друку і г. д.

Пажадана на працягу «двухтыднёвіка друку» правесьці перавыбары рэдкалегій насьценгазэт і перайменаваць іх у органы сялян даннай вёскі.

Задача Дню Друку—яшчэ шчыльней зьвязаць шырокія колы працоўных з нашымі газэтамі і часопісьмі, а праз іх—з камуністычнай партыяй.

Галоўнае, што павінна мець на ўвазе рабселькораўская арганізацыя, гэта—пераканаць рабочую і сялянскую масу, што сьвята Друку—гэта сьвята ўсіх працоўных, што друк у руках пралетарыяту мае надзвычайна вялікае значэньне ў справе сацыялістычнага будаўніцтва па ўзмацненьні эканамічнага і культурнага становішча БССР.

М. Ш.

С У Д.

За «прыхільнасьць» да прыватніка.

Загадчыкі магілеўскага аддзяленьня Цэнтраземскладу сядзяць на лаўцы падсудных ужо ня першы раз.

Пры гэтым за адну і тую-ж справу: за асаблівую «прыхільнасьць» да прыватніка.

Наперш, на лаўцы падсудных апынуліся загадчыкі Лугаўноў і Ракіцкі.

Суд вызвіў, што ўсе тавары яны збывалі не на вёску, а прыватнай кампаніі „А. Шык".

Дзякуючы гэтай кампаніі, Лугаўноў і Ракіцкі селі ў турму. Пасьля гэтага на пасады загадчыкаў земельны аддзел вылучыў больш «моцных таварышоў»—Зайчэнка і Озола, якім даў цьвёрды наказ: з кампаніяй «Шык» ніякіх гандлёвых зносін ня мець.

Але адна справа наказ, а другая справа жыцьцё.

Зайчэнка і Озол пашлі яшчэ далей за сваіх папярэднікаў. Тое, што нарабілі гэтыя, можа быць лепшым доказам, як ня трэба гандляваць дзяржаўным арганізацыям.

Самыя ходкія тавары: аўстрыйскія косы ды іншыя сельска-гаспадарчыя прылады і пры новых загадчыках пападалі не да сялян, а да „Шыкаў".

І да чаго толькі не даходзіў Зайчэнка? Гандлёвых дагавораў на біржы ён не рэгістраваў, у кнігу заносіў продаж 5—6 пудоў жалеза, у той час калі прадаваў прыватнікам на 100-200 пудоў адразу.

Зайчэнка і Озол прадалі прыватнай кампаніі ўсе будаўнічыя матар'ялы, і як раз перад пачаткам будаўнічага сэзону 1926 году склад зусім застаўся без запасаў.

Гэта скарысталі прыватнікі: усе набытыя тавары яны вывезьлі за межы Беларусі, а нотым калі «голад», на будаўнічыя матар'ялы пачаў моцна а адчувацца, пусьцілі на рынак усялякі брак, прадаючы яго па высокіх цэнах.

Але ня толькі ў гэтым віноват Зайчэнка.

Пасеньне, якое перадавалася сялянам, ніколі не сартыравалася.

Годнае прадавалі, зьмешаўшы з негодным—абы толькі прадаваць.

Усё магілеўскае аддзяленьне Цэнтраземскладу зрабілася сям'ёй Зайчэнка: цесьць—вартаўнік; жонка—у канцэлярыі; брат-памоцнік.

Усе, каму і не хацелася, «грэлі рукі» ля Зайчэнка.

Урэшце — апошняя «заслуга» Зайчэнка: не хапіла ў аддзяленьні тавараў на 1893 руб.

Справу Зайчэнка, Озола, Шыка і інш. разглядаў Магілеўскі акруговы суд, пытаньні яна разглядалася ў паказальным парадку.

Суд прыгаварыў П. Зайчэнка на 3 гады зьняволеньня, Р. Озола таксама на тры гады, але ўмоўна; Шык і яго таварышы па гандлю на 6 месяцаў зьняволеньня.

Я. Садоўскі.

Гонар сабакі ці „покровители" жывёлы Івановы.

Добра жылося Івановым у Менску. Займаў Іваноў добрую пасаду, атрымліваў за працу шмат грошай. Адным словам жыві, ды нажывай.

Аднаго ўсё-ж такі Івановым не хапала—гэта дзетак.

— Што такое дзеці ў нашу, трэцюю, эпоху?—думаюць Івановы,—лішняя забота, непатрэбная абуза. Да таго дзетак можна вельмі латва замяніць сабачкай. Яно і ня столькі заботы, ды і шмат мадней.

Былому афіцэру царскае арміі гэта вельмі да твару. Тым болей, што Тадора (жонка Іванова) так кахае, так любіць жывёліну наогул, а сабачку, ды яшчэ вялікага, асабліва.

Абзавяліся сабачкай. Сямейнае шчасьце запанавала. З разы ў тыдзень лазьня для сабачкі, кожны дзень мыцьцё зубоў, расчэсваньне кудзеркаў—былі першачарговымі заняткамі Івановай.

Тадора Іванова паходзіць з Варшавы і густы яе вельмі падобны да густаў «варшаўскіх», а мо' і яшчэ больш «заходніх». Сабачку яна любіла, як матка любіць дзіцё і ў абіду ніколі не давала. Штодзённым уважлівым аглядам сабачкі яна ўстанавіла адну ненармальнасьць у яе:

— Бацька сабачкі быў брунэт, матка—блёндынка, а сабачка, чамусьць, шатэн?

Час ішоў. Сабачка расла і стала вялікай. Назвалі яе «Нэро». Правы яе, «як сябра сям'і», таксама расьлі, і аднойчы Іванова сказала свайму «выхаванку»:

— Калі мы будзем умірацьапішам табе ўсю сваю маёмасьць. Ты-ж наш адзіны сыночак.

Усё так і прайшло-бы сваім чародам, каб у гэтай-жа кватэры ня жылі суседзі Івановых Ільяшэвічы, у якіх была работніца Эва Буткус. Апошняя мела гонар жыць у адным пакоі з «радавітым насьледнікам» Івановых. Гэтым пакоем была сумесная Івановых і Ільяшэвічаў кухня.

Жыльцы гэтага пакою—Эва Буткус і «насьледнік» Нэро ня ўжыліся і моцна пасварыліся.

Вынікам гэтай лаянкі стала тое, што Іваноў, стукнуўшы галавою Эвы Буткус аб прыпечак, наверадзіў ёй два зубы. Адзін зуб прышлося вырваць.

. . . . . .

Справа разьбіралася ў нарсудзе 1-га вучастку г. Менску пры старшыне суду т. Шлык. Іваноў атрымаў 1 месяц зьняволеньня, а Тадора—штраф.

У парадку нагляду акр. суд гэты прыгавор адмяніў і перадаў на разгляд нарсуду 1-га вучастку ў новым складзе.

З дні ў Менску цягнуўся працэс Іванова пры перапоўненай залі АВК.

Я заступіўся,—кажа Іваноў,—за абланы гонар Нэра, крычаў на Эву Буткус, махаў ёй пад нос пальцам, яна схапіла зубамі за палец, раніла яго і надламала сабе зубы. Як сабе хочаце, але так я ня мог пакінуць гэтае справы. Нэро нэрвовы, і лаянка моцна адбілася на яго слабым здароўі.

«Покровительница» жывёлы Тадора лічыць, што халера, дура, ведзьма—Буткус, а ня Нэро.

Новы склад суду пад старшынствам т. Мінкіна прыгаварыў Іванова на 1 год зьняволеньня бяз суровага адмежаваньня, а Тадору Іванову на 1 месяц прымусовых работ. Апроч гэтага, суд прыгаварыў спагнаць з Іванова 15 руб. у якасьці грамадзянскага іску на карысьць Эвы Буткус і судовыя кошты ўскладу на Івановых.

С. Азерскі.

Грамадзкія работы ў сёлетнім годзе.

18 красавіка Джярж. Плянавая Камісія зацьвердзіла плян грамадзкіх работ на 1927 год. На грамадзкія работы адпушчана 900.000 руб. На гарадох гэтыя сродкі разьмяркованы наступным чынам: Менск—250.000 р., Віцебск—200.000 р., Гомель—136.000 р., Магілеў—92.500 руб., Бабруйск—92.000 р., Барысаў—72.000 р., Ворша—9.000 руб., Полацк—9.000 р., Мазыр—14.000 р., Рэчыца—15.000 р., Слуцак і Калінінск—па 5.000 р.

Пачынаючы з 15 красавіка да 1-га кастрычніка ў Менску штодня будзе занята звыш 1.000 рабочых, у Віцебску—780, у Гомелі—525 рабочых. Усяго ў БССР у працягу гэтага часу штодня будзе занята 3.456 рабочых.

Да важнейшых работ, якія будуць праведзены ў Менску, адносяцца: каналізацыя—114.125 руб., зьмяншэньне нахілу гары на Савецкай вуліцы (каля дзярж. бібліатэкі) і пабудова гарадзкога парку ў Антонаўскай лясной дачы. У Віцебску—умацаваньне берагоў р. Заходняй-Дзьвіны, асушка мясцовасьцяў, якія затапляюцца вадою і інш. У Гомелі—пабудова месца зімоўкі для параходаў на р. Сож (75.000 р.) і частковая каналізацыя (60.000 р.).

Зараз у Менску на грамадзкіх работах занята штодня да 600 чалавек, у Барысаве—220 чал. і ў Віцебску—100 чалавек. У Віцебску работы яшчэ не пасьпелі разгарнуцца з-за адсутнасьці пляну. Усе іншыя гарады прыступаюць да работ зараз-жа па атрыманьні зацьверджанага пляну.

У акругі дадзена дырэктыва аб тым, каб найбольшы тэмп грамадзкіх работ разьвіць у сучасны момант, калі будаўнічы сэзон яшчэ не разгарнуўся, і ёсьць магчымасьць выкарыстаць вольных ад працы рабочых.

У сёлетні сэзон асаблівая ўвага будзе зьвернена на тое, каб зьмякчыць беспрацоўе сярод жанчын і падросткаў. На ўсе работы, якія могуць выконвацца жанчынамі ці падросткамі, мужчыны будуць прымацца ў абмежаваным ліку. Так, на садовых работах дадзена распараджэньне заняць усе 100 проц. жанчын, па работах у розных пляніроўках—50 проц., на рамонтах сквэраў, церасыпцы газонаў—40 проц., на работах на асушцы балот—20 проц.

С. Азерскі.

Арганізацыя сэлекцыйна-насеннай справы ў БССР.

Сэлекцыйна-насенная справа зьяўляецца адной з важнейшых сярод мерапрыёмстваў па разьвіцьцю сельскай гаспадаркі. Вопытныя установы высьветлілі, што сартавое сэлекцыйнае насеньне павышае ўраджайнасьць амаль на 20 процантаў. Гэта прымусіла Наркамзем зьвярнуць самую пільную ўвагу на плянавае разьвіцьцё работы па сэлекцыйна-насеннай справе.

Прынята рашэньне аб тым каб работа па вырашчваньню новых палепшаных гатункаў насеньня была згуртована на вопытных станцыях. Пры горацкай вопытнай станцыі будзе весьціся работа на вырашчваньню палепшаных гатункаў хлебных расьлін і лёну. Пры Менскай с-г. вопытнай станцыі будуць вырашчвацца палепшаныя гатункі бульбы, а пры Віцебскай вопытнай станцыі—палепшаныя гатункі розных агародных культур. Выпрабаваньне прыгоднасьці для Беларусі тых ці іншых сенажатных траў будзе весьціся пры Тураўскай вопытнай станцыі. Што датычыцца лубіну і сэрадэлі, то мы будзем карыстацца вынікамі работ магутнай Новазыбкаўскай с.-г. вопытнай станцыі.

Побач з навукова-дасьледчай работай па вырашчваньню палепшанага насеньня, якая разьлічана на больш-менш доўгі тэрмін, узьнікае неабходнасьць аказваць насяленьню дапамогу палепшаным насеньнем зараз жа. Дзеля гэтага будуць выкарыстаны ўсе дасягненьні ў галіне сэлекцыйнага насенаводзтва на вопытных станцыях як у СССР, так і заграніцай, а таксама палепшаны насенны матар'ял, які ўжо ёсьць у саўхозах.

Найлепшае прывознае і мясцовае палепшанае насеньне, пасьля выпрабаваньня, будзе разводзіцца на вучастках Белсельтрэсту («Госсемкультура»), якія закладаюцца ў сёлетнім годзе.

Л. Н.

Сельская гаспадарка.

Падрыхтоўка да сяўбы.

Да пачатку красавіка праз с.-г. каапэрацыю было завезена ў БССР каля 200 тысяч пуд. яравога насеньня; „Хлебапридукт" завёз каля 500 тысяч пуд.

К-ты ўзаемадапамогі не адстаюць

Да гэтага часу к-ты сялянскай узаемадапамогі загатовілі 165 тысяч пуд. аўса, 14 тысяч пуд. ячменю і 12 тысяч пуд. грэчкі.

Апроч таго, у фондах к-таў ёсьць гатоўкі 18 тысяч пуд. жыта і 97 тысяч руб.; усе гэтыя сродкі будуць выменены на ярыну.

Сяўба ў Менскай акрузе.

У 1926 г. у Менскай акрузе дзейнічалі 222 збожжаачысныя машыны. Сёлета ў акрузе будзе працаваць 285 гэткіх машын; мае быць ачышчана каля 400 тысяч пуд. насеньня, пасяўнога матар'ялу.

Пашырэньне засеву кораньплодаў.

Сёлета ў Менскай акрузе праводзіцца кампанія за пашырэньне пляну кораньплодаў, асабліва кармавых буракоў, турэпсу і моркву.

Будзе засавана 340 паказальных вучасткаў кораньплодаў, апрача вучасткаў, якія будуць арганізоўвацца самым сялянскім актывам.

Машынныя т-вы.

Арганізацыя машынных т-ваў у Менскай акрузе шпарка пашыраецца: у 1925 г. было 8 т-ваў, а зараз ужо існуе 27 т-ваў.

У т-вах ёсьць малатарні, сячкарні, плугі, драпачы і інш. Членамі іх зьяўляюцца выключна бядняцкія гаспадаркі.

СТАН АЗІМІНЫ.

Водлуг даных Цэнтральнай Статыстычнай Управы БССР, азіміна (жыта і пшаніца-азімка) вышла з пад сьнегу ў наступным выглядзе (ацэнка—у 5-цібальнай сыстэме): Полацкая округа—3, Віцебская—2,5, Барысаўская—3, Аршанская—2,5, Магілеўская — 3,1, Калінінская—2,8, Менская—2,9, Слуцкая—3,3, Бабруйская—3, Мазырская—3, Гомельская—2,7 і Рэчыцкая—2,9.

У сярэднім стан азіміны ў БССР ацэньваецца ў 2,9.

„СОРОК ПЕРВЫЙ"?

Па раёнах.

Полацк. Ужо два месяцы як спыніла сваё існаваньне насьценгазэта «Чырвоная Зара», якая выходзіла пры Вушацкім нардоме. Магчымасьць да штомесячнага выданьня газэты ёсьць, але яна не скарыстоўваецца таму, што сьпіць рэдкалегія. Ч. П.

Полацк. Пры Ветчынскай школе (Вушацкі р.) арганізован гурток «сяброў газэты», у які запісалася 14 сялян. Гурток ставіць перад сабой задачы: праводзіць галосную чытку газэт сялянам, распаўсюджваць газэты, дапамагаць у працы хаты-чытальні і інш.

Заняткі будуць праводзіцца раз у два тыдні.

Віцебск. Пры шчаціннай фабрыцы выдавалася насьценгазэта. Рабочыя прымалі актыўны ўдзел. Але ўжо даўно газэта не выдаецца, бо рабочыя бачаць, што ні адміністрацыя, ні ячэйка, ні фабком не зьвяртаюць ніякай увагі і нават не ня чытаюць.

Віцебск. Адбыліся перавыбары рэдкалегіі насьценгазэты «Связь». За апошні год лік сьценкораў узрос да 50 чалавек, з якіх 15 жанчын.

Праца рэдкалегіі на агульным сходзе рабочых і служачых п.-т. канторы прызнана здавальняючай.

У склад рэдкалегіі абрана частка новых членаў.

Гомель. У кіраўніка нашага гуртка (завод «Красный Деревообделочник») маецца сьпіс рабкораў і сьценкораў—і гэта ўсё. Гуртон існуе толькі на паперы. Ніякай працы ў гуртку не праводзіцца, бо кіраўнік на гэта мала зьвяртае ўвагі.

Рэдкалегія слаба, насьценгазэта выдаецца нерэгулярна. Для ажыўленьня рабкораўскай працы трэба арганізаваць вечар сшайкі рабселькораў з рабочымі, запрасіўшы прадстаўніка рэдакцыі.

М. Л.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Каапэратар-спэкулянт.

Язэп Абразоўскі, член праўленьня Рудзенскага спажыв. таварыства, атрымаў для каапэратыву ад Заходняга Аддзяленьня Тэкстыльсындыкату на 489 руб. 32 кап. мануфактуры. Зьнішчыўшы накладную фактуру, Абразоўскі ўвесь тэты тавар прадаў прыватнаму гандляру, за што атрымаў 50 руб. «камісійных».

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Абразоўскага за спэкуляцыю на год зьняволеньня.

За хуліганства.

Сяргей Маслоўчык, будучы п'яным, уварваўся ў дом Вольгі Валюк, дзе заліў вадою печ, якая палілася, паразьбіваў гаршкі і міскі і аблаяў гр-ку Валюк і яе дачку. Калі прышоў міліцыянэр Захно, каб яго супакоіць, Маслоўчык нанёс яму пабоі.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Маслоўчыка на два гады зьняволеньня з пазбаўленьнем правоў.

Занадта строгі

Паміж гр. вёскі Юравічы, Хутарскага с.-с., Менскай акр., Мар'яй Прышывалка і Параскай Крупін завялася спрэчка з-за зямлі. Для разбору справы на месцы зьявіўся член с.-с. Іван Пяхота (шваГер Крупін), які загадаў, каб Прышывалка спыніла спрэчку і выдалілася. Прышывалка не падчынілася. Тады Пяхота, ня доўга думаючы, упіраў ёй кулаком на галаве.

Менскі Акруговы Суд прыгаварыў Пяхоту на год зьняволеньня з суровым адмежаваньнем.

„Лёгкі хлеб".

Ю. Палянскі і Г. Палянская ўтрымлівалі ў Менску на вул. МОПР'у дом распусты. Акруговы суд прыгаварыў абаіх на 3 гады зьняволеньня.

За грабеж.

Піліп Саладуха ў хут. Ліпавы Канец, Астр-Гарадзецкага райёну, запыніў на дарозе Максіма Бладыка і забраў у яго розныя дробныя рэчы і 2 р. 50 к. грошай. Суд прыгаварыў Саладуха на 1 год зьняволеньня з суровым абмежаваньнем і пазбаўленьнем некаторых правоў.

ХРОНІКА.

Запрашэньне праф. Рубашова на кангрэс у Францыю.

Праф. БДУ С. М. Рубашоў атрымаў пэрсанальнае запрашэньне на кангрэс францускіх хірургаў, які адбудзецца ў Парыжы ўвосень сёл. году.

5000 руб. ра пабудоўку клюбу.

Адпушчана 5000 руб. на пабудову новага клюбу ў Чэрвенскім раёне. Клюб будзе абслугоўваць рабочых мясцовых прадпрыёмстваў.

Выпуск польскага пэдтэхнікуму.

Сёлета польскі пэдтэхнікум у Менску выпускае 23 настаўнікі.

Апошнія будуць размяркованы па вясковых польскіх чатырохгодках і сямігодках.

Беларускі этнаграфічны канцэрт у Маскве.

26 красавіка ў Маскве ў памяшканьні Вялікага Тэатру адбыўся шырокі этнаграфічны канцэрт для делегатаў Усес. Зьезду Саветаў. У канцэрце ўдзельнічалі артыстычныя сілы Беларускага Дзяржаўнага Тэатру.

Радыё—у дні Першамайскага сьвята.

Да дню 1-га Мая ў Менску будуць устаноўлены радыё-прыёмнікі ў наступных мясцох: у будынку ЦВК, АВК, Акрвасякамату, Аб'яднанай Бел. Вайсковай Школы і ў с.-гаспадарчай краме на Пляцу Парыскае Камуны.

Мікрафоны будуць устаноўлены: у клюбе АВК—30 красавіка да 7 гадз. увечары ў часе ўрачыстага насяджэньня Гарсавету, а 1 мая—на Пляцу Парыскае Камуны.

Падрыхтоўка настаўнікаў для літоўскіх школ.

Дзеля падрыхтоўкі настаўнікаў у літоўскія школы, Нацкамісія ЦВК БССР пастанавіла арганізаваць пры Менскім Беларэдтэхнікуме імя Ігнатоўскага спэцыяльную літоўскую сэкцыю.

Пашырэньне броварнай прамысловасьці.

Белсельтрэст прыступіў да капітальнага рамонту 5 броваряў у трэсьцівараных саўхозах, якія знаходзяцца ў Слуцкай, Бабруйскай, Менскай, Мазырскай і Аршанскай округах.

Названыя заводы будуць пушчаны ў ход з восені сёл. году.

Здарэньне.

22 красавіка, каля 16-га разьезду на Заходняй чыгунцы, каля вёскі Заазер'е, на пуцявога стоража Паланевіча напала шайка грабіцеляў. Моцна зьбіўшы Паланевіча, грабіцелі забралі ў яго 35 руб. золатам і зьніклі. Даязнаньне робіцца. Паланевіч знаходзіцца ў 1-й савецкай больніцы ў цяжкім становічы.

Аб звароце выбарчых правоў.

Зьмяшчаючы ніжэй сьпіс асоб, падаўшых заявы аб звароце ім выбарчых правоў, сэкратарыят ЦВК БССР просіць усіх грамадзян, якія маюць тыя ці іншыя матываваныя адводы, прысылаць гэткія ў ЦВК БССР не пазьней 2-хтыднёвага тэрміну з моманту надрукаваньня:

1. **Макейчык** Антон Пятрусёў—праж. у в. Навасёлкі, Астрашыцка-Гарадзецкага райёну. 2. **Хаміч** Якуб Ігнатаў—в. Бучаніна, Чырвона-Слабодзкага райёну. 3. **Шыбалевіч**—Кірэй Яўхімаў — в. Казловічы, Слуцкага райёну. 4. **Кончычаў** Саўка Янкаў в. Ліпнякі, Халмецкага райёну, Рэчыцкай акругі. 5. **Рыжковіч** Філімон Сьцяпанаў г. Бабруйск. 6. **Чабан** Мірон Яўхімаў —м. Крычава. 7. **Хацкевіч** Кастусь Ісакаў —в. Ранае, Барысаўскае акр. 3. **Хадасевіч** Андрэй Сьцяпанаў—хут. Жыліна, Барысаўскага райёну. 9. **Цюрын** Цімох Ульянаў—м. Сьвіслач. 10. **Казлаўскі** Уладзімір Мікалаеў—г. Бабруйск. 11. **Дрэвіч** Уладзімір Аўгуставіч—г. Бабруйск. 12. **Мачу**-ла Антон Антонаў—г. Бабруйск. 13. **Сінкевіч** Еўдакім Базыльё — г. Бабруйск. 14. **Ліс** Пракоп Савіч—г. Нова-Барысаў. 15. **Ціхаводаў** Міхась Янкаў—г. Нова-Барысаў. 16. **Мірун** Сьцяпан Янкаў—г. Барысаў. 17. **Сманун** Міхась Адамаў—г. Нова-Барысаў. 18. **Варанецка** Базыль Навумаў—г. Нова-Барысаў. 19. **Шкрада** Язэп Сьцяпанаў—ст. Барысаў. 20. **Вусьцінаў** Андрэй Янкаў—в. Гушчына-Прудок, Лепельскага райёну. 21. **Бухас** Лявон Яфрэмаў—г. Бабруйск.

Ч. в. аб. сэкратара ЦВК БССР **Сташэўскі.**

Апавяшчэньне.

—28 і 29 красавіка а 6 гадзіне ўвечары ў падсабіньне адбудзецца сход настаўнікаў беларусазнаўцаў.

Адказны рэдактар **М. КУДЗЕЛЬКА.**

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.	ЧАЦЬВЕР, 28 КРАСАВІКА. „ЛЕС ЦЁМНЫ" (апошні раз у гэтым сэзоне). Пачатак а 8 з паловай гадз. веч.
КІНО «ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА».	Амэрыканская фільма „СОН АЛЛАНА". Мастацкая драма ў 7 ч. з удзелам Дугласа Фэрбэнкса»
КІНО «культура».	Баявік сэзону „СЕКРЕТ КРАСОТЫ". Апроч таго, канцэрты вядомай выканаўцы цыганскіх рамансаў З. А. ЛЯШЭНКО і выступленьні выканаўцаў танцаў—трыо „Орлік".
КІНО «ПРАЛЕТАРЫ».	„Стэнлей у дэбрах Афрыкі" 2-я сэрыя ў 10 ч.

ВЫШАЎ З ДРУКУ І ПРАДАЕЦЦА

ў Выдавецкім П/А Аддзела Законадаўчых Праэктаў НКЮ—

Менск, вуліца Карла Маркса, 5

ПАДВОЙНЫ НУМАР ЧАСОПІСІ „ВЕСЬЦІ НКЮ" № 2-3.

Там-жа прадаюцца наступныя выданьні на беларускай і расейскай мовах:

1. Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы . . . . . 35 к.
2. Папраўка-Працоўны Кодэкс . . . . . 50 к.
3. Палажэньне аб судабудаўніцтве БССР . . . . . 35 к.
4. Палажэньне аб Гарадзкіх Саветах . . . . . 15 к.
5. Альфабэтна-прадметны паказальнік да Збору Законаў БССР за 1926 г. . 75 к.
6. Грамадзянскі Працэсуальны Кодэкс з альфабэтна-прадметным паказчыкам . . . . . 60 к.
7. Лясны Кодэкс з пазьнейшымі дапаўненьнямі . . . . . 20 к.
8. Зямельны Кодэкс з пазьнейшымі дапаўненьнямі . . . . . 30 к.

Пастановай сходу пайшчыкаў

Капланецкае сельска-гаспадарчае таварыства,

Бярэзінскага райёну, Барысаўскай акругі ЛІКВІДУЕЦЦА з 20-III 1927 году.

Пратэнзіі да таварыства будуць прымацца ў працягу 2-х тыдняў з дня абвяшчэньня.

Ліквідацыйная камісія.

АДКРЫТА ПАДПІСКА НА МАЙ МЕСЯЦ І ДА КАНЦА ГОДУ

НА ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ"

Орган ЦВК БССР.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На 1 месяц — — 70 к. | На 6 месяцаў 4 р. —
» 2 » 1 р. 40 » | Да канца году 5 » 40 к.
» 3 » 2 р. — |

За дадатковыя 40 кап. у месяц кожны падпішчык можа атрымаць часопісь «Маладняк»—кніжку ў 6 друкаваных аркушаў (100 стар.), якая даецца, як платны дадатак да газэты.

Газэта «Савецкая Беларусь» разам з часопісьсю «Маладняк» — 1 руб. 10 кап. у месяц.

У МАІ ўсім падпішчыкам будзе рассылацца БЯСПЛАТНА другі нумар часопісі „ЧЫРВОНАЯ КРАІНА".

Падпіска прымаецца: у Менску—у канторы газэты—рог вуліц, Ленінскай і К. Маркса, у правінцыі—упаўнаважнымі канторы і ўсімі паштова-тэлеграфнымі аддзяленьнямі і аддзяленьнямі Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ на двухмесячную часопісь літаратуры, мастацтва і крытыкі „УЗВЫШША".

13 друк. арк. „УЗВЫШША" № 2 13 друк. арк.

выходзіць з друку ў першых чыслах мая.

У ІМ ЗЬМЕШЧАНА З МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ:

1. М. БАГДАНОВІЧ—вершы беларускага складу.
2. К. ЧОРНЫ—Сястра—раман.
3. Я. ПУШЧА—Эўрова, На ростані. У прасторы зоры—вершы.
4. З. БЯДУЛЯ—Салавей—прадзіг аповесьці.
5. М. ЛУКАШЫН—вершы.
6. С. ДАРОЖНЫ—вершы.
7. ШАШАЛЕВІЧ—Сож—ніжка вершаў.
8. ТАРАС ГУШЧА—На новым месцы—з аповесьці „У глыбі Палоссяў".
9. ЎЛ. ЖЫЛКА—На эміграцыі. Цяжкі ланцуг—вершы.
10. КРАПІВА—Мой сусед. Адзае раніцы. Сьнег ідзе—сатыры новай.
11. ЮЛІУС ЯНОПІС—вершы, пераклады з літоўскай мовы Ія. Дубоўкі.
12. ВАЙСКОПФ—Сьлядат рэвалюцыі—апавяданьне (пераклад з нямецкай мовы).
13. ІЖЫ ВОЛЬКЕР—вершы—пераклад з чэшскай мовы Ул. Жылкі.
14. ПЯТРО ГЛЕБКА—Памяці М. Багдановіча—верш.

З крытыка-тэарытычных артыкулаў,

15. ПРАФ. І. ЗАМОЦІН—Максім Багдановіч.
16. А. БАБАРЭКА—М. Багдановіч у літаратурных ацэнках.
17. СКРЫБЛЮКАС—Юа. Янопіс.
18. ПРАФ. ПІАЛІТАЎ-ІВАНОЎ—Бэтговэн.
19. ЮРЫ БЯРОЗКА—Расейская мастацкая проза за 1926 г.
20. УЛ. ДУБОЎКА—Пра нашу літаратурную мову.
21. А. ШЛЮБСКІ—Канфіскацыя „Пана Тадэўша".
22. БІБЛІЯГРАФІЯ—Я. Лёсік, А. Адамовіч, В. Тушнец, Я. Кудзер.
23. ХРОНІКА.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 6 нум.—5 р. 50 кап. на 3 нум. 3 р. Кошт аднаго нумару ў продажы—1 р. 25 кап.

Адрас рэдакцыі Менск, Савецкая 63—рэдакц. газ. „Беларуская Вёска—для „Узвышша" 2—4.

Вышаў з друку і рассылаецца падпішчыкам

КРАСАВІК № 4 „БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ" КРАСАВІК № 4

ЗЬМЕСТ:

М. ГАЛАДЗЕД—Перавыбарная кампанія саветаў і далейшыя задачы партарганізацый.
КАРТЫШ-БЛУК—Некаторыя недахваты ў працы савецкіх ячэек.
Катушкін—Партыйна-выхаваўчая праца на вёсцы.
ХАТАЕВІЧ—Гомельская бальшавіцкая арганізацыя (успаміны).
ЛЕЛЕВІЧ—Кастрычнікавыя дні ў Магілеве (успаміны).
ВАСІЛЬЛЕЎ—Праца сельскіх саветаў (Мазырская округа).
Г. Ш—ЛЬ—На